WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 ЛЮТАГА 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 31
(26639)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

У БЕЛАРУСІ ВЕТЭРАНАМ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ БУДЗЕ АКАЗАНА АДНАРАЗОВАЯ ДАПАМОГА Ў ПАМЕРЫ АД BR150 ТЫС. ДА BR500 ТЫС.

У сувязі са святкаваннем 65-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ветэранам ВАВ будзе аказана аднаразовая матэрыяльная дапамога. Адпаведны ўказ № 69 Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 18 лютага.

У прыватнасці, матэрыяльная дапамога будзе аказана ўсім катэгорыям ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, членам сем'яў ваеннаслужачых, партызанаў і падпольшчыкаў, якія загінулі або прапалі без вестак у час баявых дзеянняў у гады Вялікай Айчыннай вайны, інвалідам з дзяцінства з прычыны ранення, кантузіі і калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з іх наступствамі, былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і былым непаўналетнім вязням іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны.

Памер матэрыяльнай дапамогі Героям Савецкага Саюза, асобам, узнагароджаным ордэнамі Славы трох ступеняў, Героям Сацыялістычнай Працы, удастоеным гэтага звання за заслугі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, складзе Br500 тыс.

Па Br250 тыс. атрымаюць інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, асобы, якія прымалі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размініраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах, бацькі, дзеці-інваліды з дзяцінства і не ўступіўшыя ў новы шлюб жонкі (мужы) ваеннаслужачых, партызанаў і падпольшчыкаў, якія загінулі або прапалі без вестак у час баявых дзеянняў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Br150 тыс. будзе выплачана асобам, узнагароджаным ордэнамі або медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны, асобам, якія працавалі на аб'ектах у тылавых межах дзеючых франтоў, на прыфрантавых участках чыгунак і аўтамабільных дарог; членам экіпажаў суднаў транспартнага флоту, інтэрніраваных у пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў партах іншых дзяржаў; асобам, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях горада Ленінграда ў перыяд блакады з 8 верасня 1941 года па 27 студзеня 1944 года і ўзнагароджаным медалём «За абарону Ленінграда», і асобам, узнагароджаным знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда»; інвалідам з дзяцінства з прычыны ранення, кантузіі і калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны або з іх наступствамі; былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і былым непаўналетнім вязням іншых месцаў прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны. Выплата аднаразовай матэрыяльнай дапамогі будзе праводзіцца з 1 красавіка па 1 мая 2010 года ў парадку, устаноўленым для выплаты пенсій.

НОВУЮ КАНЦЭПЦЫЮ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ БЕЛАРУСІ ПЛАНУЕЦЦА РАСПРАЦАВАЦЬ ДА ЧЭРВЕНЯ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 18 лютага правёў рабочую сустрэчу з дзяржаўным сакратаром Савета Бяспекі Леанідам Мальцавым.

Леанід Мальцаў прадставіў даклад аб выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы, у тым ліку аб ходзе распрацоўкі новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. Завяршыць гэту работу плануецца да чэрвеня гэтага года. Кіраўнік дзяржавы быў таксама праінфармаваны аб выніках работы праваахоўных органаў за мінулы год. Прэзідэнт даў даручэнне выпрацаваць дзейсныя крытэрыі ацэнкі работы праваахоўных органаў. У іх аснове павінны быць не проста колькасныя паказчыкі, а рэальная абарона жыцця, здароўя і годнасці грамадзян, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Размова ішла і аб праблеме кампенсацыі нанесенага ўрону. Як паказвае аналіз, кампенсацыя ўрону па ўсіх злачынствах і здарэннях у сярэднім складае каля 25 працэнтаў. Неабходна прымаць належныя меры, каб гэты паказчык вырас у разы. А самае галоўнае -- патрэбна эфектыўная прафілактыка злачынстваў, правапарушэнняў і недапушчэнне ўрону.

У цэнтры ўвагі на сустрэчы была і тэма барацьбы з распаўсюджваннем наркотыкаў. Хоць гэта праблема для Беларусі характэрна ў меншай ступені, чым для іншых краін рэгіёна, ні ў якім разе нельга дапускаць павелічэння колькасці нарказалежных асобаў. Прэзідэнт даручыў дасканала прааналізаваць сітуацыю ў гэтай сферы і ўзмацніць меры па барацьбе з распаўсюджваннем наркотыкаў.

На сустрэчы было закранута пытанне альтэрнатыўнай ваеннай службы. «Па гэтай тэме шмат розных інсінуацый. Між тым у Беларусі альтэрнатыва тэрміновай службе існуе. Напрыклад, акрамя тэрміновай службы ёсць служба ў рэзерве, якая з'яўляецца альтэрнатыўнай, -- сказаў Леанід Мальцаў. -- Юнакі таксама атрымліваюць воінскія спецыяльнасці на ваенных факультэтах і ваенных кафедрах у навучальных установах, а потым тэрмін іх службы складае ўсяго 6 месяцаў».

Што датычыцца дзеючага механізма вызвалення ад тэрміновай службы, то рашэнне аб гэтым на законных падставах можа прымаць Прэзідэнт. Адпаведна штогод выдаецца ўказ, на падставе якога даюцца адтэрміноўкі, у тым ліку для тых грамадзян, якія па сваіх рэлігійных перакананнях не могуць браць у рукі зброю. Паводле даных дзяржсакратара Савета Бяспекі, гэта 50—60 чалавек штогод за час прызыву. Кіраўнік дзяржавы, заслухаўшы даклад па гэтым пытанні, даручыў у адпаведнасці з 57-м артыкулам Канстытуцыі Беларусі распрацаваць закон аб праходжанні альтэрнатыўнай службы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Радавыя Перамогі

КАЛЯДЫ БАБЫ НАСТЫ

*Адна з апошніх сведак тонежскай трагедыі 77-гадовая **Настасся Паўлаўна САФОНАВА** часта кажа, што сама не ведае, як адужала гора, не звар'яцела і не памерла з голаду. Яна часта прыходзіць на вясковае скрыжаванне, дзе некалі стаяла царква. Цяпер на гэтым месцы — мемарыял смутку і памяці. Прыходзіць, каб запаліць свечку і памаліцца. І знайсці супакой. Гэта яе Каляды.*

Памяць жанчыны выразна захоўвае твары многіх аднавяскоўцаў, смяротна закатаваных і знішчаных — падчас вайны дзяўчынцы было амаль дзесяць гадоў. З цягам часу не сціраюцца з памяці нават самыя дробныя дэталі студзеньскага дня, у які нямецкія акупанты звялі рахункі з партызанскай вёскай, можа па хвілінках аднавіць падзеі апошняга дня Тонежа.

— 6 студзеня 1943 года людзі павыходзілі з лесу, каб падрыхтавацца да Калядаў і сустрэць свята ў сваёй хаце, — прыгадвае Настасся Паўлаўна. — Спадзяваліся, што на Каляды нас чапаць не стануць. Маці пайшла ў вёску, а мне даручана было мыць на рацэ бялізну.

Але даверлівыя тонежаўцы тады моцна памыліліся: гітлераўцы ўжо чакалі іх. Хапалі ўсіх: жанчын з дзецьмі, падлеткаў, старых людзей, тых, чыйго ўдзелу і тым больш віны ў той вайне было менш за ўсё.

— Немцы забілі маю маму, старэйшых сястру і брата, меншую за мяне сястрычку. Стралялі ў царкве. На другі дзень спалілі. І царкву, і вёску.

На крыжы гэтага мемарыяла ёсць агульная лічба ахвяраў тонежскай катастрофы — 261 чалавек. Ёсць пайменны пералік, з годам нараджэння кожнай ахвяры. Найменшыя з іх — дзеці, народжаныя ў перадваенным 1940-м. Ім было толькі па два гадочкі. Настассінай сястры — чатыры...

Каб не памерці з голаду, дзяўчынка хадзіла па людзях, пасвіла кароў. Калі пыталіся: «куды ідзеш, малеча?», адказвала па-дарасламу: «шукаць сваю долю». Хоць была круглаю сіратою (бацькі таксама не было — яшчэ да вайны знік па лініі НКУС), долю сваю ўсё ж знайшла. Трэба было жыць далей. А гэта значыць — гадаваць малодшую сястру, расці самой, працаваць, выйсці замуж, нарадзіць дзетак (Бог даў ёй ажно пяцёра).

І штогод прыходзіць да мемарыяла на вясковыя памінкі. Каб і праз 67 гадоў не забываліся пра тое каляднае вяртанне аднавяскоўцаў з лесу. І нарэшце ўзвялі новую царкву побач з месцам, дзе стаяла колішняя. Настасся Паўлаўна Сафонава, яе суседкі і сяброўкі спадзяюцца дачакацца гэтага дня.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Механізм пастаноўкі на чаргу маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў зменіцца ў Беларусі з 19 лютага

Гэта прадугледжана ўказам № 543, якім уносяцца дапаўненні і змяненні ва ўказ ад 29 лістапада 2005 года № 565 «Аб некаторых мерах па рэгуляванні жыллёвых адносінаў», паведамляе БЕЛТА.

Неабходнасць прыняцця ўказа № 543 была абумоўлена тым, што тэмпы будаўніцтва ў Беларусі не паспявалі за тэмпамі разрастання чаргі маючых патрэбу, паведамілі ў Мінжылкамгасе. Для таго, каб выключыць магчымасць камерцыйнай нажывы некаторых грамадзян за кошт будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай і забяспечыць падтрымку грамадзянам, якія сапраўды не маюць жылля, і прыняты некаторыя змяненні і дапаўненні ў дзеючае заканадаўства. Дакумент не мае зваротнай сілы, і ўсе грамадзяне, якія прыняты ўжо на ўлік маючых патрэбу, застануцца стаяць у чарзе.

Указам № 543, у прыватнасці, прадугледжана, што пры падзеле чаргі паўналетнія члены сям'і будуць прымацца на асобны ўлік не з даты нараджэння, як было раней, а з даты надыходу паўналецця. Таксама будзе выключана магчымасць будаўніцтва жылля на льготных умовах, устаноўленых для чаргавікоў, грамадзянамі, якія пабудавалі ўжо жылое памяшканне і займаюць яго на падставе дагавора найму, арэнды, бязвыплатнага карыстання, але не рэгіструюць права ўласнасці на гэта памяшканне. Раней, напрыклад, грамадзяне, якія самастойна будавалі жыллё долевым спосабам, маглі ў той перыяд часу, пакуль жыллё яшчэ не было зарэгістравана, скарыстацца гэтым і паралельна пабудаваць ЖБК з дзяржпадтрымкай.

Змяненні дзейнага заканадаўства закранулі і такі крытэрый пастаноўкі на ўлік, як забеспячэнне агульнай плошчай жылля менш за 15 кв. м на аднаго чалавека. На ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, як і раней, не змогуць быць прыняты грамадзяне, забяспечаныя агульнай жылой плошчай звыш гэтай нормы. Але пры прыняцці на ўлік грамадзян разлік забяспечанасці агульнай плошчай будзе вызначацца, зыходзячы з сумы плошчы ўсіх жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ва ўласнасці або карыстанні грамадзяніна і членаў яго сям'і, якія пражываюць сумесна ў населеным пункце па месцы прыняцця на ўлік. Да гэтага часу разлік забяспечанасці агульнай плошчай вызначаўся, зыходзячы з сумы плошчы ўсіх жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ва ўласнасці або карыстанні грамадзяніна і толькі тых членаў яго сям'і, з якімі ён прымаўся на ўлік.

Не трэба хвалявацца тым, хто ўпершыню ўступіў у шлюб, — іх будуць прымаць на ўлік маючых патрэбу, як і раней, у тым выпадку, калі ні адзін з іх не мае ва ўласнасці асобнай кватэры або асобнага аднакватэрнага жылога дома і (або) не з'яўляецца найманнікам асобнага жылля па месцы прыняцця на ўлік.

Пасля ўступлення ў сілу дакумента на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у Мінскім раёне не паставяць і іншагародніх, якія пражылі тут менш за 5 гадоў. Раней такая норма існавала толькі для Мінска.

(Больш падрабязна ў наступным нумары.)

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ЛОГОЙСКОГО РАЙПО (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания животноводческой фермы, об. пл. 1489,7 кв.м, расположенного по адресу: Минская область, Логойский район, д. Слаговище

Начальная цена с НДС – 381 058 800 бел. руб. Площадь земельного участка 2,8144 га. Задаток в сумме 50 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **24.03.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 23.03.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ИНФОРМИРУЕТ

В извещении о проведении 25 февраля 2010 года 96-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) зданий, сооружений и помещений коммунальной собственности г. Минска (газета «Вечерний Минск» от 12 февраля 2010 г., газета «Звязда» от 13 февраля 2010 г.) **исключить строки:**

32, 33, 114 (лоты №№ 32, 33, 114).

Телефон для справок 227 40 22.

САМАБЫТНЫ ТАЛЕНТ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў вядучага майстра сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы народнага артыста СССР Генадзя Аўсянікава з 75-годдзем.

«Самабытны талент, бліскучае акцёрскае майстэрства і нязменная вернасць выцвёвай праўдзе дазволілі Вам стварыць шэраг яскравых і незабыўных вобразаў сапраўдных народных герояў, якія ўражваюць цэласнасцю характару, шчырасцю пачуццяў, душэўнай сілай і адкрытасцю. Спектаклі і фільмы з Вашым удзелам сталі класікай айчыннага мастацтва». Аляксандр Лукашэнка пажадаў артысту і ў далейшым на творчым шляху мноства новых цікавых роляў і любові ўдзячных гледачоў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

СЦІПЛАЯ АБАЯЛЬНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА ХАРАКТАРУ

Яшчэ не «вечар» — скажа Генадзь Аўсянікаў падчас свайго бенефісу.

Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА.

Артыст-купалавец абраў для гэтага спектакль Дударава «Вечар», які будзе іграць 21 лютага. Такім чынам ён адзначыць сваё 75-годдзе — выконваючы ролю звычайнага беларускага дзеда з вёскі, які чакае радасці новых сустрэч.

Генадзь Аўсянікаў стаў апошнім беларускім акцёрам, які атрымаў званне народнага артыста СССР — у 1991-ым. Але сам уладальнік носіць яго вельмі сціпла, ён увогуле не ганарлівы чалавек, а як пагутарыць — дык такі ж просты, як і большасць яго герояў. Можа таму часам здаецца, што ён і не іграе, ды быццам і не трэба яму спецыяльна ўжывацца ў ролі ў спектаклях пра нас, пра беларусаў — ён ведае, як чалавек адсюль будзе праяўляць тыя ці іншыя эмоцыі, як гэты чалавек будзе рэагаваць на тыя ці іншыя сітуацыі.

Але галоўнае: углядзіцеся ў твар Аўсянікава — і вы зразумееце, што значыць прыродная беларуская дабрыня, якую яму не трэба іграць. Як такое не заўважыць і як не адзначыць? Таму і званне народнага артыста Беларусі ён атрымаў за 15 гадоў да ўсесаюзнага ўшанавання. Ён наш — і больш нічога тут не скажаш. На Магілёўшчыне нарадзіўся, да беларускай тэатральнай школы належыць. І служыць усё жыццё аднаму тэатру — Нацыянальнаму. Пры тым, што гэты артыст ведае, што значыць чакаць роляў гадамі, іграць у масоўках. Як ведае і тое, што ўсё ў жыцці прыходзіць у свой час. З'яўляюцца п'есы, напісаныя нібыта для цябе (як некалі ў спектаклях паводле Макаёнка праявіўся талент Аўсянікава). Ніякіх грандыёзных планаў на жыццё Генадзь Сцяпанавіч ніколі не будаваў, аднак у яго атрымалася ўсё па-максімуму: і ганаровыя ўзнагароды імя Францішка Скарыны, і дзяржпрэмія, і адзнака «За духоўнае адраджэнне».

СТАР. 2

Антыкрызісная эканоміка

СУВЕРЭНІТЭТ ГАРАНТУЕ ЭКАНОМІКА ВЕДАЎ...

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Маюць ці не рацыю тыя, хто спадзяецца, што эканамічнае ўзнаўленне ў свеце можа ўжо ў хуткім часе прывесці туды, дзе мы знаходзіліся да крызісу? Многія аналітыкі сцвярджаюць, што гэтага пакуль не адбудзецца. У прыватнасці, у гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» вядомы эксперт, першы намеснік дырэктара РУП «Нацыянальнае інвестыцыйнае агенцтва» Георгій ГРЫЦ выказаў думку, што ўзнаўлення попыту сёлета і ў наступным годзе да ўзроўню 2007—2008 гадоў чакаць не трэба. Наогул жа, цяпер усе добра ведаюць, як крызіс паўплываў на сусветную эканоміку і ў што гэта вылілася напрыканцы 2008-га і на працягу 2009-га. Іншая рэч — дзе цяпер мы знаходзімся пасля цяжкага мінулага года? Якія нас чакаюць перспектывы? Гэтыя і іншыя пытанні мы закранулі падчас размовы з Георгіем Грыцам.

— Свет сутыкнуўся не проста з шараговым крызісам, фактычна зламалася неаліберальная грашова-крэдытная сістэма, заснаваная на льготным крэдытаванні заходняга ўзору, — кажа Георгій Грыц. — Сёння вяртанне да старой грашова-крэдытнай сістэмы, выпуску нейкіх другасных, траціных фінансавых дакументаў няма, таму што гэта ставіць пад пагрозу ўсю сусветную эканоміку. Таму дзяржава ў разы павялічыла сваю ролю ўмяшання не толькі ў справы на макраэканамічным узроўні, але і ў справы суб'ектаў гаспадарання, пачынаючы ад банкаў і заканчваючы прадпрыемствамі. Адбылася фактычная змена ўзаемаадносінаў у сусветнай эканоміцы. На мой погляд, хуткага ўзнаўлення попыту ў 2010—2011 гадах да ўзроўню 2007—2008 гадоў не адбудзецца. Гэта не толькі мой пункт гледжання — да гэтага схіляюцца міжнародныя інстытуты. Чакаць хуткага ўзнаўлення, паўтаруся, не выпадае. Тым больш, ёсць пагрозы, якія, на жаль, робяць перадумовы да таго, што сітуацыя можа ўзмацніцца: гэта пытанні з банкруцтвам шэрагу краін у Еўрасаюзе, пытанне вельмі дрэннай фінансавай сітуацыі ў ЗША, дзе назіраюцца дзве вядомыя праблемы — дзяржаўны доўг, які перавысіў 60 працэнтаў ад валавога ўнутранага прадукту, і фактычны крах пенсійнай сістэмы. Што датычыцца апошняга, калі нічога не зменіцца, то праз 4-5 гадоў там у пенсійных фондаў не будзе магчымасці выконваць свае абавязацельствы перад пенсіянерамі, фактычна яны становяцца банкрутамі. А гэта трыльёны долараў, сацыяльны канфлікт...

— Праблемы сусветнай эканомікі непасрэдна адбіліся на экспартнай дзейнасці айчынных прадпрыемстваў, што, зразумела, уплывае на эканамічны стан краіны ў цэлым. Таму кіраўніцтвам рэспублікі і быў зроблены шэраг захадаў, каб пераадолець наступствы глабальнага крызісу. У прыватнасці, на гэта накіраваныя захады па лібералізацыі эканамічнай дзейнасці, робіцца стаўка на інавацыйнае развіццё. Георгій Васільевіч, ці магчымыя яшчэ нейкія варыянты?..

— Ва ўмовах крызісу Беларусь прыступіла да сур'ёзнай рэструктурызацыі сваёй эканомікі. Тым больш, што дзеянні нашага партнёра, саюзніка, суседа падштурхоўваюць да таго, каб перайсці ва ўзаемаадносінах з намі на чыста рынкавыя адносіны. Фактычна Расія на першае месца ставіць неадкладныя інтарэсы, яны не гатовыя на якіясьці доўгатэрміновыя стратэгічныя адносіны, у тым ліку са сваім бліжэйшым саюзнікам, таму што ў іх таксама сітуацыя ў эканоміцы складваецца не самым лепшым чынам. Таму у нас цяпер унікальны гістарычны і адзіны шанц — гэта сканцэнтраваць і адміністрацыйныя, і фінансавыя, і іншыя рэсурсы, у тым ліку пазыкі, на якіясьці прыярытэтах. Гэтыя прыярытэты, па вялікім рахунку, вызначаныя — эканоміка ведаў. У аснове ляжыць праграма інавацыйнага развіцця, якая прынятая Саветам Міністраў, хоць усё ж такі гэта праграма дакрызіснага перыяду, гэта, хутчэй, праграма мадэрнізацыі, чым карэннай рэструктурызацыі і формаў развіцця новай прамысловай палітыкі. Я думаю, размова павінна ісці аб пераглядзе наогул прыярытэтаў фарміравання новай інавацыйнай палітыкі, гэта значыць, трэба сканцэнтраваць намаганні на якіясьці прарыўных тэхналогіях. Не проста нанатэхналогіях, а на канкрэтных праектах, стварыць вытворчасць з канкрэтнай наменклатурай, і яна павінна быць запатрабаванай сусветным рынкам, асабліва ў экспартнай арыентацыі. Таму што сысці ад набыцця імпартнай сыравіны і камплектавых частак у сярэднетэрміновай перспектыве наўрад ці нам удасца. Таму нам патрэбна валюта, каб аплачваць расійскія газ, нафту, метал і г.д.

У еўрапейцаў няма альтэрнатывы, пусціць на самацёк сітуацыю ў Грэцыі яны не могуць. Калі Грэцыя абвесціць дэфолт, гэта фактычна прывядзе да моцнай дэвальвацыі еўра як валюты, якая прывядзе і да краху Еўрасаюза.

СТАР. 2

МОКРЫ СНЕГ І ДОЖДЖ

У выхадныя на тэрыторыю Беларусі завітае вільготнае паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава. Таму ў найбліжэйшыя дні чакаюцца часам даволі інтэнсіўныя ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, а ў пятніцу і суботу месцамі дождж. Тэмпература сёння ўдзень, а ў суботу на працягу сутак ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, у нядзелю 0—7 марозу, па поўначы Віцебскай вобласці на працягу сутак да 9—11 марозу. У пачатку наступнага тыдня захаваецца няўстойлівае надвор'ei.

Сяргей КУРКАЧ.

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На наступным тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

22 лютага — галоўны спецыяліст аддзела арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Таццяна Валер'еўна ДЗЯНІСІК.

23 лютага — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Маргарыта Іванаўна БЕЛЬСКАЯ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У РАСІІ ПРАПАНАВАЛІ ЎВЕСЦІ ХАРЧОВЫЯ КАРТКІ

Расійскі збожжавы саюз (РЗС) накіраваў у Мінсельгас прапанову ўвесці сацыяльныя харчовыя карткі для малазабяспечаных расіян.

У РЗС лічаць, што на такія карткі дзяржава павінна налічыць вызначаную суму сродкаў, якія могуць разглядацца як субсідыі на куплю тых або іншых тавараў. Акрамя ўвядзення картак павінен быць зацверджаны пералік прадуктаў, якія могуць аплачвацца такімі карткамі. Кіраўнік РЗС Аркадзь Злачэўскі падкрэсліў, што прамова можа ісці аб харчовых таварах, вырабленых выключна на ўнутраным рынку.

Увядзенне харчовых картак для маламаёмасных жыхароў Расіі абмяркоўвалася яшчэ ў сярэдзіне 2008 года. З такой прапановай выступілі на пасяджэнні Грамадскай палаты айчынныя бізнэсмены. Акрамя таго, апытанне, праведзенае ў сакавіку 2009 года, паказала, што 62 % расіян падтрымліваюць ідэю ўвядзення картак на прадукты. Аднак 39 % удзельнікаў даследавання адзначылі, што гэтае мерапрыемства будзе вельмі выдатковым для бюджэту краіны.

НА ЗША НАСОЎВАЕЦЦА «ПЕНСІЙНЫ» КРЫЗІС

Недахоп сродкаў дзяржаўных пенсійных фондаў і фондаў, якія адказваюць за ахову здароўя ў ЗША, можа перавысіць адзін трыльён долараў.

Агульны аб'ём сродкаў, якія ўрад ЗША павінен быў вылучыць на дзейных работнікаў і на пенсіянераў, складае сёння 3,35 трыльёна долараў. Пры гэтым пакуль на аплату дзейных і будучых рахункаў вылучана толькі 2,35 трыльёна долараў.

У аналітычным цэнтры Pew Center перакананыя, што дзірка ў фінансаванні насамрэч можа стаць яшчэ большай, бо ў даследаванні не ўлічваліся велічэзныя інвестыцыйныя страты, якія фонды панеслі ў другой палове 2008 года. Магчымыя меры для прадухілення такога крызісу абяцаюць быць непапулярнымі — памяншэнне сацыяльных выдаткаў, павышэнне падаткаў і скарачэнне ўрадавых службаў. Праблемы з пенсійнымі сродкамі ў ЗША пачаліся задоўга да рэцэсіі. Узроўні сацыяльнай падтрымкі раслі, а грошай на іх не было.

У НІГЕРЫ ПАЧАЎСЯ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕРАВАРОТ

У чацвер апазіцыйныя сілы Нігера паспрабавалі зрабіць дзяржаўны пераварот. У сталіцы краіны завязалася перастрэлка, а ў палацы прэзідэнта ўспыхнуў пажар.

Куляметныя чэргі і выбухі былі чутныя ва ўрадавым квартале. Прэзідэнцкая гвардыя ўступіла ў бой з бунтаўнікамі, спрабуючы падавіць мяцеж і прадухіліць дзяржаўны пераварот. Палітычная сітуацыя ў гэтай афрыканскай краіне ўскладнілася некалькі месяцаў таму.

Белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО 26 МАРТА 2010 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ОЧНОЙ ФОРМЕ

Повестка дня

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белагропромбанк» за 2009 год и задачах на 2010 год.
2. О заключении Ревизионной комиссии ОАО «Белагропромбанк» по годовому отчету банка за 2009 год.
3. Об утверждении годового отчета ОАО «Белагропромбанк» за 2009 год.
4. О распределении прибыли банка за 2009 год и направлениях использования прибыли в 2010 году.
5. О выборах нового состава Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк».
6. О выборах нового состава Ревизионной комиссии ОАО «Белагропромбанк».

Время начала проведения собрания – 15.00.
Место проведения собрания – г. Минск, проспект Жукова, 3.
Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, будет составляться на основании реестра владельцев акций, сформированного по состоянию на 1 марта 2010 года.

Лица, имеющие право на участие в Общем собрании, начиная с 19 марта 2010 года, с 10.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, проспект Жукова, 3 могут знакомиться со следующими материалами по вопросам повестки дня:
- информационный бюллетень о показателях работы банка за 2009 год;
- бухгалтерский баланс ОАО «Белагропромбанк» на 1 января 2010 г., отчет о прибыли и убытках, отчет об изменении капитала, отчет о движении денежных средств за 2009 год;
- проекты решений годового Общего собрания акционеров ОАО «Белагропромбанк»;
- аудиторское заключение о достоверности годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности;
- заключение Ревизионной комиссии ОАО «Белагропромбанк» по результатам проверки деятельности банка за 2009 год.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, будет проводиться 26 марта т.г. по месту проведения собрания с 13.00 до 14.45 при предъявлении документов, подтверждающих полномочия.

Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 218 56 12.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

Время работы Контакт-Центра Банка:
8.00 - 20.00 - рабочие дни;
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ.
Звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, MTC) - по тарифам операторов мобильной связи.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.02.2010 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 912,00	1 чэшская крона	153,92
▼ 1 еўра	3 950,13	1 польскі злоты	990,63
1 латвійскі лат	5 568,41	▼ 1 расійскі рубель	96,70
1 літоўскі літ	1 142,99	1 украінская грыўня	363,77

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	30,1138
UAH	37,4084
1000 BYR	10,3626
EUR	40,8825

Агенцтва Уладзіміра Грацова

СЯРГЕЮ КАРТЭСУ — 75

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Беларусі Сяргея Картэса з 75-годдзем. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Вас па праву называюць адным з самых яркіх прадстаўнікоў сучаснай беларускай кампазітарскай школы, якому падуладны самыя розныя музычныя жанры, — адзначаецца, у прыватнасці, у віншаванні. — Дзякуючы Вашаму таленту, непаўторнай творчай манеры, энергіі і энтузіязму беларуская опера атрымала новае сцэнічнае ўвасабленне і сучасную музычную мову».

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што Сяргей Картэс яшчэ доўгія гады будзе гэтак жа плённа працаваць на карысць нацыянальнай культуры, і пажадаў юбіляру здароўя, невычэрпнага натхнення, шчасця і дабрабыту.

ТВОРЧЫ ЛЁС ЗВЯЗАНЫ З БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛЁЙ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Расійскай Федэрацыі Юрыя Антонава з 65-годдзем.

У віншаванні, у прыватнасці, адзначаецца: «Мы ганарымся тым, што Ваша жыццё і творчы лёс непарыўна звязаныя з беларускай зямлёй, дзе Вы зрабілі першыя крокі ў музыцы і атрымалі пуцёўку ў вялікае творчае жыццё. У нашай краіне Вы заваявалі сэрцы адданых прыхільнікаў, якія з нецярпеннем чакаюць сустрэч з любімым артыстам».

«Няхай Ваш дзіўны талент заўсёды зачароўвае слухачоў, дорыць людзям радасць і добры настрой», — пажадаў Прэзідэнт артысту.

Мінскі этап Кубка свету — шчаслівая ўзлётная пляцоўка

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам адкрытага чэмпіянату краіны па самба на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які праходзіць у Мінску як этап Кубка свету.

«Шчыра вітаю ўдзельнікаў і гасцей сёлетніх спаборніцтваў. Няхай слаўныя традыцыі беларускіх самбістаў знаходзяць годны працяг на чэмпіянаце, які адкрываецца ўжо ў чатырнаццаты раз, — гаворыцца ў прывітанні. — Спадзяюся, што гэты від спорту будзе ўцягваць у сваю арбіту ўсё больш моладзі, паколькі ён уваходзіць у праграму падрыхтоўкі абаронцаў Айчыны». «Не сумняваюся, што турнір пройдзе ва ўпартай і сумленнай спартыўнай барацьбе, у якой пераможа наймацнейшы», — перакананы кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка пажадаў усім удзельнікам здароўя, дабрабыту і ўдачы ў пакарэнні спартыўных вяршыняў. «Няхай мінскі этап Кубка свету стане для барцоў шчаслівай узлётнай пляцоўкай да новых перамог».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выбары-2010

ПРАВА НА ПАМЫЛКУ

Стаць кандыдатам у дэпутаты можна будзе і з недакладнасцямі ў дэкларацыі — неістотнымі

Дэкларацыі заўжды былі для ўдзельнікаў перадвыбарнай гонкі ледзь не самым коўзкім месцам — зрабіўшы недакладны рух, можна без цырымоніі сысці з дыстанцыі. Узяць нават апошнія парламенцкія выбары — адзін з кандыдатаў ледзь не пазбавіўся рэгістрацыі з-за таго, што незадэкляраваў «Запарожац» 1982 года выпуску, які прадаў, але не зняў з уліку... Здаралася і такое, што спрэчкі ішлі вакол няшчасных некалькіх тысяч рублёў. Аднак скрупулёзныя выбаркамы, як правіла, спраўна выносілі вердыкт: інфармацыя ў дэкларацыі не адпавядае рэчаіснасці — адмовіць у рэгістрацыі. Па фармальных прыкметах быццам бы і так, але ж «цана пытання» была часта занадта смешнай... Толькі вось ахвярам такіх недарэчнасцяў было зусім не да смеху.

Цяпер сітуацыя, трэба меркаваць, зменіцца: папраўкі ў выбарчым заканадаўстве ўводзяць крытэрый істотнасці скажэння інфармацыі. А ўжо канкрэтныя рамкі дазволенага вызначае Цэнтрвыбаркам. І на ўчарашнім пасяджэнні гэтыя рамкі былі вызначаныя: што лічыцца неістотным, а што становіцца падставай для адмовы ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты.

— Істотны характар мае, па-першае, дэклараванне ў меншым памеры агульнай сумы гадавога даходу, калі неадпаведнасць складае больш за 10 адсоткаў агульнай сумы гадавога даходу, — паведаміла член Цэнтрвыбаркама Надзея КІСЯЛЁВА. — Па-другое, адсутнасць звестак аб нерухомасці, якая належыць на праве ўласнасці, транспартных сродках, аб каштоўных паперах ці ўказанне неадпаведных рэчаіснасці звестак аб колькасці каштоўных папер. Па-трэцяе, адсутнасць звестак аб долі, не пацверджанай акцыямі ў статутным фондзе юрыдычнай асобы, за выключэннем юрыдычных асобаў, якія на момант падачы дэкларацыі знаходзіліся ў працэсе ліквідацыі.

І як заўважыла спадарыня Кісялёва, нават гэтыя, істотныя, парушэнні не абавязваюць выбарчую камісію адмовіць у рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты. «Камісія можа як зарэгістраваць, так і адмовіць у рэгістрацыі — гэта яе права».

Якія «вольнасці» ў дэкларацыі не могуць у прынцыпе каштаваць рэгістрацыі патэнцыйным прэтэндэнтам на дэпутацкі мандат? Паводле слоў рашэння ЦВК, неістотным лічыцца адсутнасць ці ўказанне неадпаведных рэчаіснасці звестак аб чэках «Маёмасць», «Жыллё», аб аблігацыях. Не будзе вялікім грахом таксама, калі патэнцыйны кандыдат не паведаміць у дэкларацыі пра выкрадзены і нязнойдзены транспартны сродак. Або пазначыць не адпаведныя сапраўднасці звесткі аб даходах, калі яны ўнесеныя ў дэкларацыю на падставе даведкі, выдадзенай арганізацыяй. Ці няправільна пазначыць агульную плошчу нерухомасці, якая яму належыць.

У дэкларацыі патэнцыйнаму кандыдату трэба будзе паведамляць свае даходы з 1 студзеня па 31 снежня 2009 года, прычым без выліку падаткаў, збораў дзі іншых утрыманняў. Пры гэтым могуць не пазначацца факты аплаты пуцёвак прафсаюзам, ці падарункі, аднаразовая матэрыяльная дапамога і іншыя падобныя бонусы, дакладны пералік якіх ёсць у пастанове Цэнтральнай камісіі. На практыцы былі прэцэдэнты, калі кандыдату даводзілася даказваць, што ён не вярблюд, пасля таго як забыўся паведаміць пра аднаразовую прэмію ў 30 тысяч рублёў.

— Што да транспартных сродкаў, па якіх узнікае большасць пытанняў, — адзначыла Надзея Кісялёва, — у дэкларацыі пазначаюцца звесткі аб ТС, зарэгістраваных падраздзяленнямі ДАІ на дату падачы дэкларацыі, незалежна ад іх тэхнічнага стану.

Дэкларацыя аб даходах і маёмасці (поруч з іншымі неабходнымі для рэгістрацыі дакументамі) павінна быць пададзеная ў адпаведны выбаркам не пазней за 15 сакавіка. Камісія ў сваю чаргу правярае іх дакладнасць. Па сутнасці, інфармацыя пра «багацце» кандыдата збіраецца для выбаршчыкаў: каб яны ведалі агульны гадавы даход свайго магчымага прадстаўніка і якая маёмасць яму належыць.

— Увогуле, шчыра кажучы, цяпер бедным быць ужо нявыгадна, — заўважыла старшыня ЦВК Лідзія ЯРМОШЫНА, — таму я думаю, што хутка мы будзем сутыкацца з недакладнасцю наадварот — калі звесткі пра маёмасць будуць завышацца — дэкларавацца нейкая маёмасць на Канарах, а мы так і не зможам гэта праверыць. Усё тое, што ў кандыдата знаходзіцца за мяжой, не правяраюць.

У гутарцы з журналістамі яна прызнала, што «на жаль, некаторыя нашы выбарчыя камісіі занадта жорстка падыходзілі да кандыдатаў, і адмаўлялі ў рэгістрацыі за дробязі, неістотныя нейкія памаркі, тэхнічныя памылкі, часта дапушчаныя па віне тых органаў, што выдавалі даведкі аб даходах. І фармальна ўсё было правільна, нават калі неадпаведнасць была мінімальная. Цяпер закон дае права Цэнтральнай камісіі вызначыць для ўсіх арганізатараў выбараў межы, у рамках якіх кандыдат можа памыліцца. Калі памылка нязначная і сапраўды не з'яўляецца наўмысным жаданнем сказіць звесткі і ўвесці ў зман выбаршчыкаў, яна будзе даравацца патэнцыйным кандыдатам і яны будуць удзельнічаць у выбарах. Гэта першы такі досвед, дастаткова рэвалюцыйны — паглядзім як ён будзе працаваць». Дарэчы, паводле слоў Лідзіі Ярмошынай, падчас прэзідэнцкіх выбараў Цэнтральная выбарчая камісія ўласнаручна будзе вызначаць, якое скажэнне інфармацыі ў дэкларацыі лічыць істотным ці неістотным — «па кожнай персаналіі асобна».

ДА ПЯЦІ ХВІЛІН НА ПЕРАКОНВАННЕ

Уздзейнічаць на выбаршчыкаў прэтэндэнты на дэпутацкі мандат змогуць і па радыё

Магчымасці мясцовага радыёвяшчання — да паслуг кандыдатаў. Ліміт бясплатнага радыёвыступлення, вызначаны ЦВК, — 5 хвілін. Аднак гэта верхняя мяжа, сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай ЛАЗАВІК не выключае, што калі кандыдатаў у асобнай мясцовасці будзе шмат, выбаркам можа прыняць рашэнне аб скарачэнні працягласці выступлення. Кандыдатаў у дэпутаты Мінскага гар- і аблсавета можна будзе паслухаць у эфіры радыёстанцыі «Сталіца». У эфіры абласных тэлерадыёкампаній прагучаць выступленні кандыдатаў у дэпутаты абласных Саветаў, раённага і гарадскога радыё — Саветаў базавага ўзроўню. Дату і час кожнага выступлення вызначыць жараб'ёўка. Сакратар Цэнтральнай камісіі нагадаў, што змест свайго выступлення вызначае сам кандыдат, аднак ён павінен адпавядаць патрабаванням заканадаўства. Пры невыкананні іх кандыдату можа быць адмоўлена ў выступленні. Заўжды турбуюцца і наконт роўных магчымасцяў кандыдатаў, аднолькавага доступу да СМІ. «Мы абавязаныя забяспечыць роўнасць», — заўважыла Лідзія Ярмошына.

КАБ НЕ КІДАЦЬ ЦЕНЬ...

Валерый МІЦКЕВІЧ пакінуў свой пост у Цэнтрвыбаркаме па этычных меркаваннях

На ўчарашнім пасяджэнні Цэнтральнай камісіі было вырашана і кадравае пытанне. Намеснікам старшыні Цэнтрвыбаркама абраны Вадзім ІПАТАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў. Такім чынам, ён змяніў свайго папярэдніка Валерыя Міцкевіча ўжо на абодвух яго пастах (і ў Цэнтры, і ў Цэнтральнай камісіі). Спадар Міцкевіч падаў заяву аб вызваленні ад пасады ў ЦВК у сувязі з прызначэннем яго намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. «З этычных меркаванняў ён прыняў рашэнне пакінуць свой пост у Цэнтральнай камісіі, каб ніхто не мог кінуць камень у незалежнасць Цэнтрвыбаркама, асабліва падчас прэзідэнцкіх выбараў», — пракаментавала Л. Ярмошына.

Ала МАЧАЛАВА.

У Брусель цераз Парыж

Парламенцкі дзённік

Беларускі бок разлічвае на падтрымку Францыі ў адносінах з ЕС

Старшыня Савета Рэспублікі Барыс БАТУРА, упершыню прымаючы ў верхняй палаце парламента нядаўна прызначанага **пасла Францыі ў Беларусі Мішэля РЭНЭРЫ,** выказаў спадзяванне, што добрыя традыцыі, закладзеныя яго папярэднікам Мірэй Мюсо, будуць працягнутыя. Як працягнецца і плённае супрацоўніцтва дзвюх краін, у прыватнасці, у гуманітарным кірунку — у галіне навукі, адукацыі, культуры. Асаблівыя надзеі ўскладаюцца ўсё ж на падтрымку нашых французскіх партнёраў у адносінах па лініі ЕС:

— Тая падтрымка з боку Францыі (асабліва ў перыяд яе старшынства ў Еўрасаюзе), якую мы адчувалі ў ажыццяўленні канструктыўнага дыялогу з Бруселем, спадзяёмся, будзе працягнутая.

Мішэль Рэнэры ў гутарцы са старшынёй Савета Рэспублікі (і да гонару яму будзе сказана, ён цудоўна абыходзіўся без паслуг перакладчыка) падкрэсліў: «Нас чакае шмат працы, каб развіваць нашы адносіны, асабліва ў сферы міжпарламенцкіх стасункаў».

Кіраўнік верхняй палаты парламента таксама адзначыў доўгае зацішша ў міжпарламенцкіх кантактах, пасля якога тым не менш наступіў прарыў. Ён прыгадаў візіт у нашу краіну групы сяброўства «Францыя — Беларусь» пад кіраўніцтвам спадара Ламбэра. І паведаміў пра тое, што аналагічная група па супрацоўніцтве, утвораная ў беларускім парламенце (нагадаем, што ўзначальвае яе Ніна Мазай, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы), рыхтуецца да паездкі ў Францыю. Візіт запланаваны на май.

— Тут якраз пачынаецца нармальны інтэнсіўны дыялог, — заўважае Барыс Батура. — І мы спадзяёмся, што ён перакладзецца ў далейшым на адносіны з Еўрапарламентам і Еўрасаюзам, бо ў дыялогу нараджаецца ісціна.

Б. Батура зрабіў акцэнт на тым, што Беларусі апошнім часам давозіцца адстойваць свой выбар шляху развіцця, даказваючы правільнасць гэтага знешнепалітычнага курсу, які заключаецца ў шматвектарнасці, збалансаванасці ў адносінах з Усходам і Захадам.

— Мы прыхільныя да прагматызму, паслядоўнасці, незалежнасці ў знешнепалітычным курсе, — падкрэслівае палітык.

Паводле яго слоў, рэзалюцыя Еўрапарламента (адносна паўнапраўнага ўдзелу беларускага парламента ў Асамблеі Еўранэст толькі пасля правядзення дэмакратычных выбараў), «мякка кажучы, выклікае здзіўленне».

— Такі дыскрымінацыйны шлях і стаўленне да беларускага парламента неправамерныя, — кажа Барыс БАТУРА.

І, на думку спікера, французскія парламентарыі ды ў цэлым палітычныя колы Францыі маглі б, улічваючы тыя канструктыўныя і прагматычныя адносіны з Беларуссю, якія былі да гэтага часу, паўплываць на гэты працэс. Ён акцэнтуе, што наша краіна сур'ёзна зацікаўленая ўдзельнічаць ва Усходнім партнёрстве, ёю ўжо ўнесены шэраг прапаноў па праектах — у галіне энергетыкі, трансгранічнага супрацоўніцтва і іншых сферах...

Ала МАЧАЛАВА.

Прэзідэнт Расіі ўзнагародзіў беларускіх военачальнікаў ордэнам Дружбы

Як гаворыцца ў адпаведным указе, яны ўдастоены ўзнагароды «за вялікі ўклад у развіццё і ўмацаванне расійска-беларускага супрацоўніцтва», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Крамля.

Ордэнам Дружбы ўзнагароджаны старшыня Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Беларусі Сяргей Гурулёў, які да снежня мінулага года займаў пасаду начальніка Генштаба Узброеных Сілаў, намеснік міністра абароны Юрый Меранцоў, намеснік начальніка Генштаба Узброеных Сілаў — начальнік галоўнага аператыўнага ўпраўлення Уладзімір Сулімаў, намеснік камандуючага Сухапутнымі войскамі — начальнік упраўлення баявой падрыхтоўкі і падрыхтоўкі рэзерваў Валерый Хахлоў.

Кіёскі на прыпынку не вернуцца

Пра гэта паведаміў журналістам галоўны спецыяліст упраўлення арганізацыі гандлю і паслуг Міністэрства гандлю Юрый МАНЬКОЎ.

— Пазіцыя, што кіёскі — гэта нецывілізаваная форма гандлю, застаецца. І не толькі ў Беларусі выказваецца такое меркаванне. Вы ведаеце, што і суседзі нашы таксама пра гэта кажуць.

Па словах Юрыя Манькова, гандаль павінен быць цывілізаваным, а не праз маленькае акенца недзе за вуглом вам нешта прадалі і вы не можаце адэкватна ацаніць тое, што купляеце. Нагадаем, што кіёскі цалкам зніклі з мінскіх прыпынкаў напрыканцы 2008 года.

Настасся ЗАНЬКО.

СЦІПЛАЯ АБАЯЛЬНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА ХАРАКТАРУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Не люблю загадваць, планаваць, ствараць сабе праграмы, — кажа юбіляр. — Калісьці ў мяне была кніга «Крытыка гоцкай праграмы», якую напісаў Карл Маркс. Вось і не люблю праграм. У нашай прафесіі наогул планаваць нічога немагчыма — яна вельмі залежная. Вось паступіў у інстытут — адна прыступка. Закончыў — другая. Для некаторых гэта ўжо максімум жаданняў. Але потым у мяне пачаўся іншы «максімум» — трапіў у тэатр Янкі Купалы, дзе і працую ўсё жыццё. Вось каб дабрацца да нейкага «максімуму», спачатку трэба прайсці ўсе «мінімумы». А дзеля гэтага таксама трэба працаваць — па максімуму. Бо інакш у тэатры не бывае. І калі табе выпала аднойчы роля, якую ты хацеў бы, то тут ужо трэба «браць быка за рогі».

— Гэта ў прафесійным жыцці. А ў чалавечым вы здольныя «браць быка за рогі»? Бо ўсе людзі, напэўна, мараць пра адно: каб быў дом, тылы надзейныя.

— Не бывае, каб асобна было чалавечае і прафесійнае жыццё. Ёсць жыццё чалавека. А ў яго ўжо так здараецца, што і сюды пайшоў, і туды, і адну жанчыну памяняў, і другую. І тое адбылося, і тое не адбылося... Ёсць жыццё, якое ты сабе падарыў сам. Мая прафесія — гэта нібы адростак ад ствала пад назвай жыццё. Але такі, які можа сядзець глыбока, ісці нават з самых каранёў. Так, чалавеку бывае нешта дадзена. Але вось так яно само сабой не зробіцца, не ўкараніцца без намаганняў, у маім выпадку без тых людзей, якія спрыяюць, — іншых акцёраў, рэжысёраў, драматургаў. Якія партнёры — не малаважна для артыста. Таму што тэатр — справа калектыўная. Бывае тэатр аднаго акцёра, але, як казаў Іраклій Андроннікаў, калі-нікалі можна паставіць пад сумненні ўсе тры гэтыя словы: тэатр?аднаго?акцёра?

— Але вы ж не ставіце, бо самі іграеце ў такім спектаклі?

— Так. А прыйшоў бы разумнік і паставіў пад сумненне: гэта — мастацтва? Мяне асабіста і ўсё мастацтва крытыкаваць можа любы чалавек, калі яму захочацца. Але ў 1836 годзе Аляксандр Сяргеевіч сказаў: «Хвалу и клевету приемли равнодушно, и не оспаривай глупца».

— Вы можаце ўспрымаць крытыку раўнадушна?

— Вельмі проста. Што я, буду гараваць, калі хто-небудзь кажа: ой, што ён зрабіў у гэтай ролі? Можа ў чалавека балелі зубы, якраз калі ён глядзеў спектакль. Дык ён і не ўспрымае. А потым можа напісаць. Тут жа безліч асабістых фактараў. І кожны з гледачоў суперажывае і саўдзельнічае. Калі здольны на гэта. Але такім чынам ствараюцца спектаклі — і пры ўдзеле гледача, які далучаецца сваімі эмоцыямі.

— Вы гэта адчуваеце, калі іграеце мона-спектакль «Беларусь у фантастычных апавяданнях»?

— Толькі такім чынам, як я сказаў, гэта бывае. Я адчуваю, што камусьці магу не падабацца, тады чалавек можа ўстаць і пайсці... Я думаю, што людзі ўсё-такі слухаюць, пра што я кажу. А тым больш што, можа, нехта раней Яна Баршчэўскага не чытаў і думае: «А хто гэта такі?» Бывае такое. Прызнаюся, што пакуль не ўзялі гэтую інсцэніроўку, я сам яго не чытаў. Я думаў, што ён напісаў твор на беларускай мове, а гэта ж з польскай пераклад. А калі для мяне ёсць адкрыццё, то я магу яго даць і іншым. Іншая рэч, што не атрымоўваецца заўсёды аднолькава. Кожны акцёр павінен жыць па формуле: сёння, тут, зараз, упершыню. Вялікая формула.

23.00 «Спецыяльны карэспандэнт».
0.00 Маст. фільм «Выпадковы спадарожнік».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.10 Баявік «Міраж».
7.30 Мультфільм.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Дзікі свет».
8.45 «Іх норавы».
9.20 «Ядзім дома!».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.25 «Алтар Перамогі». Карнікі.
14.15 Камедыя «Законы прывабнасці».
16.25 Серыял «Адвакат».
17.25 «І зноў добры дзень!».
18.25 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
19.55 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.30 Серыял «УГРО».
0.15 «Авіятары».

ТНТ

5.00 «Эй, Арнольд!». Мультсерыял.
6.00 «Прыгоды Джымі Нейтрона, хлопчыка-генія». Мультсерыял.
7.25 Серыял «Саша + Маша».
8.00 «Невытлумачальна, але факт».
8.55 «Першая Нацыянальная латарэя».
9.00 «Школа рамонту».
10.00 «Сука-каханне». Дак. фільм.
11.00, 4.00 «Камедзі Клаб».
12.00 «Comedy Woman».
13.00 «Cosmopolitan». Відэаверсія.
14.00 Серыял «Шчаслівыя разам».
16.00 Баявік «Прыстанак зла».
18.00, 21.00 Серыял «Наша Russia».
19.00 Баявік «Прыстанак зла-II: Апакаліпсіс».
22.00, 1.10 «Дом-2».
23.30 «Забойная ліга».
0.40 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
2.05 Камедыя «Тлустая піца».

КУЛЬТУРА

5.30 «Ералаш».
9.00, 0.50, 1.50 Праграма перадач.
9.10 «Звычайны канцэрт» з Эдуардам Эфіравым.
9.40 Маст. фільм «Нечаканы госць».
11.10 «Усё да лепшага... Аліна Пакроўская».
11.50 «Набытак рэспублікі».
12.10 Маст. фільм «Увага, чарапаха!».
13.30 М/ф «Свіння-капілка».
13.40, 0.55 «Вывучаючы гульню жыцця». Дак. фільм.
14.35 «Што рабіць?».
15.25 Маст. фільм «Небяспечны ўзрост».
16.55 Балет «Жызель». Парыжская нацыянальная опера.
19.00 «Сямнаццаць імгненняў, або Іронія лёсу».
20.20 Вялікія раманы. Джон Ленан і Ёка Она.
20.50 Маст. фільм «Усё на продаж».
22.40 «Гэтыя вочы Мішэль Морган...». Дак. фільм.
23.35 «Джэм-5». Дэкстар Гардон.
0.40 «Перфіл і Фама». М/ф.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 10.00, 15.00, 1.00 «Мінулы час».
6.50, 9.45, 14.45, 5.50 «Ералаш».
7.15, 3.15 Творчы вечар Гелены Велікананавай. 1991 год.
8.35, 4.35 «Яшчэ адна ўсмешка».
9.15, 5.15 «Ранішняя пошта».
9.45 Ералаш.
11.00, 2.00 «Народжаныя ў СССР».
12.30 «Да і пасля...». Год 1956.
13.40 «Мелодыі Барыса Маравусава». 1981 год.
15.45 «Фестываль у Сан-Рэма». 1985 год.
17.00 «На прывязі ля ўзлётнай паласы». Дак. фільм.
18.10 Маст. фільм «Пераходны ўзрост».
19.40, 0.45 «Добрай ночы, малыя».
20.00 «Быў час».
21.00 Капітал-шоу «Поле цудаў». 1991 год.
22.15 «Гэты фантастычны свет». Тэлеспектакль. 1982 год.
23.10 «На крутым пераломе». XXVII з'езд КПСС. Люты, 1986 год.

НАША КІНО

6.30, 12.30 Камедыя «Палонныя ўдачы».
8.30, 14.30 Камедыя «Зайчык».
10.30, 16.30 Меладрама «Баскае стварэнне».
18.30, 0.30 Камедыя «Трыфальдзіна з Бергама».
20.45, 2.45 Меладрама «Небяспечны ўзрост».
22.30, 4.30 Камедыя «Іспанская актрыса для рускага міністра».

ДОМ КІНО

3.00, 11.00 Серыял «Стацкі саветнік». Заключная серыя.
3.55 Маст. фільм «Плюс адзін».
5.30 Камедыя «Вусаты нянь».
6.45 Дэтэктыў «Справа «Пярэстых».
8.20 Камедыя «Кропка, кропка, коска...».
9.45 Меладрама «З каханымі не расставайцеся».
11.55 Маст. фільм «Стрэл».
13.10 Маст. фільм «Дзелавыя людзі».
14.30 Меладрама «З жыцця адпачываючых».
15.50 Камедыя «Рэтра ўтраіх».
17.25 Трагікамедыя «Асенні марафон».
19.00 Серыял «Ваша чэсць».
19.45 Маст. фільм «Сіняя барада».
21.20 Камедыя «Джэнтльмены ўдачы».
22.45 Маст. фільм «Прарыў».
0.05 Меладрама «З табой і без цябе».
1.25 Маст. фільм «На гранатавых астравах».

ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Драма «Калі прыходзіць каханне».
10.35, 18.35, 2.35 Меладрама «Суперкрос».
12.00, 20.00, 4.00 Камедыя «Бацька».
13.20, 21.20, 5.20 Меладрама «Нацюрморт».
15.15, 23.15, 7.15 Драма «Царазабойца».

TV1000

3.00 Драма «Дзеля любові да гульні».
5.15 Драма «Сямейныя каштоўнасці».
7.05 Драма «Планета Ка-Пэкс».
9.00 Драма «Скачок».
11.00 Драма «Тайнае жыццё слоў».
13.00 Драма «Велікан».
15.00 Камедыя «Лекар Адамс».
17.00 Камедыя «Фокуснікі».
19.00 Драма «Студыя 54».
21.00 Драма «Англійскі пацыент».
0.00 Драма «Якая танцуе ў цемры».

ТБЗ

5.00 Дак. фільм «Тайныя знакі».
6.00 Рэцэпты лёсу.
7.00 М/ф.
7.15 М/ф «Чалавек-павук».
8.00 Маст. фільм «Крымінальны талент».
11.15 Серыял «Мерлін».
13.15 Серыял «Вострыў Харпера».
15.00 Дак. фільм «Тайны вялікіх магаў».
16.00 Маст. фільм «Бермудскі трохвугольнік: на парозе новых адкрыццяў».
18.00 Дак. фільм «Гарадскія легенды».
19.00 Маст. фільм «Крул».
21.30, 2.45 Маст. фільм «Страшны суд».
0.00 Маст. фільм «Прыгоды барона Мюнхгаўзена».

РАМАНТЫКА

7.00, 19.35, 1.50 «Ідэальная пара».
7.55 «Стол на траіх».
12.20 «Гатуем разам з Анхелем Ласана».
13.20 «Рэванш-II».
17.50 «Казачны прынц».
18.40 «Марыя Роса».
20.30 «Мужчынскія гісторыі, адрасаваныя жанчынам».
21.30 «Такое жыццё».
22.25 «Дакрануцца да неба».
0.00 «Дона Флор і два яе мужы».
0.55 «Прысутнасць Аніты».
2.40 «Плата не па заслугах».

HALLMARK

1.00 Маст. фільм «Уплывовы агент».
2.40 Серыял «Следства вядзе да Вінчы-II».
3.30 Маст. фільм «Голад».
5.00 Маст. фільм «Цені на сонцы».
6.40 Маст. фільм «Упартыя сэрцы».
8.20 Драма «Жонкі, пра якіх ён забыў».
10.00 Серыял «Зачараваныя-V».
13.25 Маст. фільм «Галівудскія жонкі».
15.00 Маст. фільм «Шчаслівая сямёрка».
16.40 Маст. фільм «Місіс Вашынгтон едзе ў каледж Сміта».
18.20 Маст. фільм «Трымай кулакі».
20.00 Серыял «Быць Эрыкай».
20.50 Серыял «Сэкс у вялікім Парыжы».
21.40 Маст. фільм «Унікум».

AXN SCI FI

7.30, 23.05 Геракл: Легендарныя падарожжы.
11.45 Прытворшчык.
15.05 Мюзікл Ксанаду.
16.45 Сховішча.
18.25 Баявік «Геракл і вогненнае кола».
20.00 Трылер «Смяротны вірус».
21.25 Склад № 13.
1.35 Кароткаметражныя фільмы.

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Фільм-казка «Старая, старая казка».
6.35, 10.35, 14.35 Мультсерыял «Віні-Пух ідзе ў госці». М/ф «Ліса і заяц».
7.00, 11.00 М/ф «Чалавечка намаляваў я».
7.55, 11.55 М/ф: «Русалачка», «Вагончык», «Як качаня-музыкант стала футбалістам», «Вясёлая карусель», «Хатні цырк».
15.00 Маст. фільм «Маленькія ўцекачы».
16.20 Мультсерыял «Віні-Пух і дзень турбот». М/ф «Краіна Аркестрыя».
17.00 М/ф «Канёк-гарбунок».
18.10 М/ф: «Пастушка і камінар», «Перапынак № 1».

ЗДАРОЎЕ

5.00, 17.30 Не выходзячы з дома.
5.35, 18.05, 19.35 Увага, ежа!
6.00, 18.30 Выдаткі вытворчасці.
6.35 Вялікая прабежка.
7.05 Я расту.
7.40, 12.25, 2.50 Правілы здароўя.
8.05 Практыка здароўя.
8.40, 23.00 Застацца ў жывых.
9.10, 11.15, 23.30, 1.40 Набалелае пытанне.
9.50, 0.10 Кабінет прыгажосці.
10.20, 0.40 Сакрэты здароўя.
10.45, 1.05 Пачуцці чалавека.
11.55, 2.20 Выкрыццё прадуктаў.
12.50, 3.15 Дзіця нарадзілася.
13.20, 3.45 Цела чалавека.
13.50, 4.15 Нетрадыцыйная медыцына.
14.20 Школа розуму.
14.55 Будзем здаровыя.
15.25 Клінічны гіпноз.
15.55 Панацэя.
16.25 Я чакаю дзіця.
17.00 Гісторыя хваробаў.
19.00 Курс лячэння.
20.00 Я перамог гэты боль.
20.30 Колькі вам гадоў?
21.00 Лініі жыцця.
4.45 Энцыклапедыя памылак.

ТДК

6.00, 11.50, 12.50, 13.10, 13.55, 14.50, 15.55, 16.50, 17.50, 18.50, 22.00 Парады ТДК.
6.35, 13.00, 14.55 Усё лепшае, для Вас.
7.35, 10.00, 17.00 Красуня.
8.00 Добрай раніцы, Каханая!
9.00 Ваш капрыз.
10.50 Каралекс.
11.00, 14.00, 2.00 Нашы дзеці.
12.00, 18.00, 22.10, 5.00 Ваш доктар.
13.00 Прыгажосць і здароўе.
13.25, 4.00 Твой дом.
15.55, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
19.00 Люстэрка жыцця.
21.00 Сэксуальная рэвалюцыя.
22.30 «Алоха, Гаваі».
3.00 Гісторыя поспеху.

DISCOVERY

7.00 Як гэта ўстроена?
7.25, 4.45 З чаго гэта зроблена?
7.55, 15.15, 3.50 Лабараторыя выбуховых ідэй.
8.50, 14.20, 21.00, 2.55 Разбуральнікі легендаў.
9.45 «Відавочца».
10.40 У пагоні за ўраганам.
11.35 Выжыць любой цаной.
13.25 Рачныя монстры.
16.10, 2.00 Скрыўленне часу.
17.05 Махінатары на трасе.
18.00 Вялікія і хуткія.
19.00 Амерыканскі чопер.
20.00 Дарожныя монстры.
22.00 Рос Кемп.
0.00 Жанчыны-забойцы.
1.00 Рай, які абярнуўся пекламе.
5.10 Неверагодны горад.
6.05 Ігіганцкія будоўлі.

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 12.00 «Самы цяжкі ў свеце ремонт».
6.00 «Шляхі эвалюцыі».
7.00, 13.00, 14.00 «Небяспечныя сустрэчы».
8.00 «Здольнасці малпаў».
9.00 «Чалавек-мядзведзь».
10.00 «Чорныя мядзведзі Тайваня».
11.00 «Інжынерныя ідэі».
15.00 «Мяжа».
16.00 «Укусі мяне або падарожжы вірусолага».
17.00 «Туземцы ў Англіі».
18.00 «Ліхтугі за мяжой».
19.00, 4.00 «Расследаванні авіякатастроф».
20.00, 23.00, 2.00 «Погляд знутры».
21.00, 0.00, 3.00 «Самыя горшыя турмы гісторыі».
22.00, 1.00 «З пункта погляду навукі».

TRAVEL

7.00, 12.00, 23.00, 5.00 Сусветны вандроўнік.
8.00 Па чыгунках Швейцарыі.
9.00 Шляхі зносінаў.
10.00, 21.00, 1.00 Бясстрашныя падарожнікі.
13.00, 17.00, 22.00 Планета ежы.
14.00 Шэф-кухар за мяжой.
18.00, 2.00 У пошуках згубленага снегу.
18.30, 2.30 Лыжны свет.
19.00, 3.00 Раз'юшаная планета.
19.30, 3.30 ФотаДаследчыкі.
20.00, 4.00 У пошуках невядомага.
0.00 Сусветная адысея Джуліяна і Камілы.

ANIMAL PLANET

7.00 Вуліца лемураў.
7.25, 12.15 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
7.50 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
8.45 Тэрыторыя жывёл.
9.40, 6.10 Аддзел па абароне жывёл.
10.05, 22.55, 3.30 Паліцыя Маямі: аддзел па ахове жывёл.
10.55, 5.20 Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.
11.50, 6.35 «Будні дэльфінаў».
12.45 Жывёлы, падобныя на нас.
13.40 «Загадкавыя жывёлы з Джао».
14.35 SOS дзікай прыроды.
15.30 «Дзённік вялікай кошкі».
16.25 «Сапраўдны згублены свет».
17.20 Чужак сярод мядзведзяў.
18.15 «Небяспечныя маршруты Макса».
19.10 Рай для шымпанзэ.
20.10 Прыгоды Осціна Сцівенса.
21.05, 1.40 Дзікія і небяспечныя.
23.50 «Галапагоскія астравы».
0.45 Кітовыя войны.
4.25 Пад покрывам ночы.

EUROSPORT

Зімовыя Алімпійскія гульні
4.00, 11.45, 15.00, 17.45 Лыжныя гонкі. Жанчыны. 30 км класічным стылем.
5.00 Хакей. Матч за 3-е месца.
7.30, 8.15, 9.15 Навіны.
7.40 Канькабежны спорт. Гонка праследавання.
8.25, 11.00 Горныя лыжы. Мужчыны. Слалам.
9.25, 13.30, 16.30, 2.00 Фігурнае катанне. Паказальнае выступленне.
13.00, 16.00, 18.30, 1.00 Фінішная прамая.
19.00 Адваротны адлік.
19.30 Лыжныя гонкі. Мужчыны. 50 км класічным стылем.
21.45 Хакей. Мужчыны. Фінал.

MTV

5.00, 2.00 Music.
6.00 «Стэрэа_раніца».
8.00, 4.00 Рашн м'юзік.
9.10, 18.30 «Аватар».
10.05 Уся праўда пра дзяцінства знакамітасцяў.
10.55 Трэндзі.
11.20 MTV Top 20.
12.20 Праверка чутак.
12.50 News блок Weekly.
13.20 Зоркі на далоні.
13.50 Віртуаліці.
14.20 Тэлепорт.
14.50 Гарачае кіно.
15.20, 20.40 Каралі танцпола.
16.15 Наступны.
16.40 Самыя знакамітыя, раскошныя і непрыстойна багатыя.
17.35, 22.25 «Губка Боб квадратныя штонікі».
19.25 Падстава.
19.50 Тачку на пракачку.
21.35 «Сэкс» з Тэкілай.
23.20 «Паўднёвы парк».
0.10 Зорны бой насмерць.
1.00 MTV Live.

ІНТЭР+

7.00, 23.35 Парк аўтамабільнага перыяду.
7.30 Украінская топ-дваццатка.
8.50 «Квадратны метр».
9.30 М/ф: «Віні-Пух», «Віні-Пух і дзень турбот».
10.00 Украіна, уставай!
10.30 Вяселле для цябе.
10.55 Тыдзень моды.
11.30 Самы разумны.
13.00, 1.10 Футбол. Чэмпіянат Украіны. «Чарнаморац» — «Таўрыя».
14.55 Маст. фільм «Спартыўны гонар».
16.40, 20.45, 5.05 Месца сустрэчы.
17.50 Формула кахання.
18.35, 3.45 Маст. фільм «Вялікая розніца».
20.00, 3.00 Падрабязнасці тыдня.
22.05 Маст. фільм «Чалавек на Эйфелевай вежы».
23.35 Не першы погляд.
0.25 Дак. фільм «Depeche Mode» ва Украіне».
6.25 Феерыя падарожжаў.

16.25 ФІЛЬМ ДНЯ

«ЛАПУХІ» (Расія, 2009 г.)

Трое правінцыяльных ідыётаў, якія мараць аб акцёрскай кар'еры, выбіваюць сабе праслухоўванне ў мафіі і талентамі сваімі зморваюць насмерць яе хроснага бацьку, пасля чаго ўцякаюць на выкрадзеным «Запарожцы».

Рэжысёр — Сарык Андрэасян. **У ролях:** Яўген Нікішын, Сяргей Пісарэнка, Эндру Нджогу.

Тэлесеткі

На «Зорных танцах» — новы персанаж

Забаўляльны праект Першага канала, які распачаўся на мінулым тыдні, набудзе новага ўдзельніка. Дакладней, удзельніцу. Прадзюсары шоу палічылі, што трэці сезон запар проста глядзець на тое, як папулярныя асобы ў пары з прафесійнымі танцорамі асвойваюць новыя рухі і рытмы, гледачам будзе не надта цікава, і вырашылі ўвесці ў праект прынцыпова новага персанажа.

Цяпер да дзвюх вядучых мужчынскага танцавальнага сезона Вольгі Курышка і Аліны Краўцовай далучыцца загадкавая паненка — «культурная сцерва», як вызначылі яе амплуа стваральнікі. Яе роля заключаецца ў тым, каб расказваць і па магчымасці паказваць закуліснае жыццё праекта: няўдачы на трэніроўках, інтрыгі, рамантычныя стасункі паміж удзельнікамі і г.д. Першы такі дзённік «Зорных танцаў» мае выйсці ўжо ў гэту суботу, а далей яго плануецца паказваць штодня да заканчэння сезона.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

АНТ ВЫКРЫЛЕ ШПІЁНСКУЮ СЕТКУ

Праўда, амаль праз 50 гадоў пасля падзей і тое ў кіно — у новым дакументальным фільме праекта «Адваротны адлік»

У чарговай серыі дакументальнага праекта рэжысёр-пастаноўшчык Людміла Клінцова і аўтар сцэнарыя Таццяна Сухоцкая звярнуліся да гісторыі, бадай, самага вядомага дыверсанта 50-х, «пана Яна» Філістовіча...

Улетку 1952 года супрацоўнікі маскоўскага Галоўпаштамта звярнулі ўвагу на шэраг лістоў, напісаных дзіцячым почыркам, але адрасаваных выключна за мяжу — у Федэратыўную Рэспубліку Германія. Лісты накіраваліся ў спецыяльную лабараторыю Міністэрства дзяржбяспекі. Праз нейкі час спецыялісты выявілі напісаную нябачным чарнілам зашыфраваную інфармацыю, пасля расшыфроўкі якой стала вядома, што на тэрыторыі СССР дзейнічае шпіёнская сетка — з цэнтрам у Беларускай ССР.

База дыверсантаў, як высветлілі ўжо беларускія чэкісты, месцілася ў лясах, недалёка ад Маладзечна — менавіта там у вёсцы Паняцічы Ільянскага раёна раптам з'явіўся месціч Янка Філістовіч, які эміграваў на захад яшчэ ў 1944 годзе... Дагэтуль на тэрыторыі БССР ужо затрымліваліся або ліквідавалі некалькі дыверсійных груп, колькасцю ад 3 да 12 чалавек — як жа пагледзелі Філістовіча, занепакоіліся спецслужбы. 26-гадовы «амерыканскі засланец» цягам года збіраў патрэбныя звесткі, свабодна перамяшчаўся па краіне, кіраваў цэлым падпольным атрадам і нават спрабаваў выдаваць уласную газету!

Для мінскіх супрацоўнікаў дзяржбяспекі гэта быў фактычна правал — не дзіўна, што падрабязнасці гэтай справы доўгі час ляжалі пад сукном. Аб тым, як і каму ўсё ж удалося затрымаць Філістовіча, разважаюць у фільме «Шпіён з-пад Вілейкі» гісторыкі Барыс Канстанцінаў і Ігар Сервачынскі, а таксама дырэктар Нацыянальнага архіва Беларусі Вячаслаў Селяменеў. У эфіры АНТ гэта серыя выйдзе 26 лютага.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

«Музычны суд» № 2: асцярожна, справа зачыняецца

Зусім хутка завершыцца другая частка праекта тэлеканала АНТ «Музычны суд». Сёння адбудзецца трэцяе шоу, пасля якога стануць вядомыя імёны ўсіх аўтараў, што прайшлі ў фінал. На сёння ў іх ліку самародкаў-аматараў няма, людзі ўсё больш дасведчаныя — спявак і кампазітар Яўген Курасаў з песняй «What are you up for», кіраўнік студыі эстраднай песні Вольга Мяшкова-Швец і яе «Mystery», удзельнік гурта «Жнюў» Алег Рыпенка з песняй «Зорка» і саліст гурта «Дразды» Віталь Карпанаў з самай іранічнай песняй за ўсё шоу «Тры рублі».

У фінале праекта арганізатары абяцаюць назваць не толькі другога пераможцу, якому дастанецца спецыяльны прыз — гасцявая паездка ў Нарвегію на «Еўрабачанне-2010», але таксама раскрыць інтрыгу — музычны гурт, які так доўга збіралася стварыць АНТ пад сваім крылом, нарэшце з'явіўся на свет. Праўда, у ім зусім не адны дзяўчаты мадэльнага тыпу, а ўдзельнікі і пераможцы папярэдняга маштабнага праекта «Новыя галасы Беларусі», якія самі вырашылі аб'яднацца ў калектыў і назвалі яго на ўзор старога савецкага фільма — «3+2». Імёны ўдзельнікаў тэлеканал пакуль што не раскрывае, але вядома, што ў склад гурта ўвайшлі як мінімум два пераможцы «Новых галасоў Беларусі», цяперашнія салісты Прэзідэнцкага аркестра Беларусі Арцём Міхаленка і Егіязар Фарашан. А заявіць пра сябе наваспечаны калектыў збіраецца вельмі гучна — маладыя выканаўцы падалі заяўку на ўдзел у беларускім адборы на «Еўрабачанне»!

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

36,6 ЗДАРОЎЕ СЭРЦА — У ВАШЫХ РУКАХ

САРДЭЧНА-САСУДЗІСТЫЯ захворванні па-ранейшаму займаюць лідзіруючую пазіцыю сярод прычын смяротнасці. Безумоўна, медыкі навучыліся лячыць многія з іх, а лекі дапамагаюць хворым весці амаль звычайны лад жыцця. Але ўсё адно даводзіцца ў чымсьці сябе абмяжоўваць. Таму лепш да хваробы не даводзіць. А для гэтага пра сэрца трэба ведаць усё. Ну, калі не ўсё, дык многае...

«Чалавек з вялікім сэрцам...»

Найбольш хутка сэрца расце ў першы год жыцця і ў перыяд палавога сталення.

У норме сэрца важыць у мужчын прыкладна 332 г, у жанчын крыху менш — 253 г. Лічыцца, што сэрца павінна быць велічынёй з кулак яго ўладальніка. Павялічваецца сэрца ў памерах або за кошт разрастання сардэчнай мышцы, або з-за расшырэння яго поласцяў — жалудачкаў. Прычын тут можа быць некалькі. Напрыклад, калі чалавек — спартсмен, штодзень трэніруецца, то інтэнсіўныя фізічныя нагрузкі патрабуюць і ад сэрца больш актыўнай работы: большага прытоку крыві, павелічэння частаты сардэчных скарачэнняў. Гэта прыводзіць да таго, што клеткі сардэчнай мышцы павялічваюцца ў памерах (так званае «сэрца спартсмена»). Іншыя прычыны павелічэння сэрца: захворванні (прыроджаныя парокі, гіпертанія, вірусны эндакардыт і г.д.); алкагольная інтаксікацыя.

Сардэчныя хваробы перадаюцца ў спадчыну

Генетычная схільнасць — гэта толькі адзін з дзесяці фактараў рызыкі. Бярыце ў разлік і іншыя: пол, узрост, курэнне, высокі крывяны ціск, высокі халестэрын, гіпадынамія, лішняя вага, цукровы дыябет, стрэс і нервовыя перагрузкі.

Жаночае сэрца абараняюць гармоны

Тэарэтычна гэта праўда. Калі ў жанчыны нармальны менструальны цыкл, калі яна не прымае лекаў, якія сур'ёзна ўплываюць на гарманальны фон, эстрагены ахоўваюць яе сардэчна-сасудзістую сістэму. Да наступлення менапаўзы — потым арганізм страчвае эстрагены, а разам з імі і засцярогу, і неўзабаве жаночы пол даганяе мужчынскі ў тым, што датычыцца атэрасклерозу. Так бы жанчыны і жылі шчасліва да клімаксу, калі б вялі здаровы лад жыцця. Аднак стрэсы, курэнне, алкаголь, некантралюемая гіпертанія зніжаюць эстрагенавую засцярогу сасудаў. Таму кардыёлагі ўжо не здзіўляюцца пацыенткам 25—35 гадоў з інфарктамі і стэнакардыяй.

Каб умацаваць сэрца, трэба есці як мага больш прадуктаў з высокім утрыманнем калію

Спалучэнне «як мага больш» робіць гэта сцвярджэнне небяспечным. Калій сапраўды неабходны для нармальнай работы сэрца. Яго асноўныя крыніцы — раслінная паходжанне, таму няма нічога дрэннага ў тым, каб павялічыць у меню колькасць печанай бульбы, ліставы салаты, капусты, фасолі, гароху, бананаў, вотруб'я, сухафруктаў і іншых прадуктаў, багатых на калій. Аднак наш арганізм у любым выпадку возьме столькі калію, колькі яму трэба, а астатняе выведзе з мачой. У гэтым і хаваецца праблема: трэба ведаць, у якім стане ныркі. Гіперкаліемія больш небяспечная, чым дэфіцыт калію ў арганізме, — яна можа выклікаць спыненне сэрца. Таму прымяняць бескантрольна і па прынцыпе «як мага больш» дабаўкі з каліем нельга!

Магній і справы сардэчныя

Вядома, што хваробы сэрца і сасудаў залежаць ад збірання халестэрыну ў сасудах. Колькасць халестэрыну ў арганізме рэгулюе лецыцін — незаменная амінакіслата. Усе амінакіслоты сінтэзуюцца з раслінных прадуктаў. Але сінтэзавацца без ферменту, які ўтрымлівае вітамін B_6 (пірыдаксін), лецыцін не можа. А пірыдаксін дзейнічае толькі ў прысутнасці магнію.

Самымі багатымі крыніцамі магнію сярод прывычных прадуктаў з'яўляюцца кунжут, арэхі, семкі, разынкі, чарнасліў, бананы, фасоля, бульба, а таксама вотруб'е, грэцкія, аўсяныя крупы, грэцкі мёд. Сутачная норма магнію: для жанчын — каля 300 мг, для мужчын — 400 мг.

Тлустыя прадукты пагаршаюць работу сэрца

Насамрэч некаторыя тлушчы паляпшаюць работу сэрца. 2—3 штотыднёвыя порцыі марской рыбы, якая ўтрымлівае ненасычаныя тлустыя кіслоты амега-3, зніжаюць рызыку развіцця інфаркту. Амега-3 паніжаюць у крыві ўзровень «дрэннага» халестэрыну. Зусім супрацьлеглы эфект аказваюць насычаныя тлушчы (сметанковае масла і іншыя жывёльныя тлушчы) — яны забіваюць атэрасклератычнымі бляшкамі жыццёва важныя артэрыі.

Лішняя вага негатыўна адбіваецца на рабоце сардэчнай мышцы

Такі паказчык, як індэкс масы цела, сапраўды можа далучыць вас да групы рызыкі па сардэчных захворваннях. Калі ён больш за 30, вы знаходзіцеся практычна за адзін крок ад інфаркту. Паўната павялічвае нагрузку на сэрца. Яму даводзіцца значна больш працаваць, каб прапампаваць такое вялікае цела. І крывяны ціск будзе трымацца на высокіх лічбах.

Усе курцы рызыкуюць жыццём...

Курэнне выклікае спазм сасудаў, якія сілкуюць сэрца (смолы тытуню мяняюць іх структуру), і павышае згусальнасць крыві, што паскарае ўтварэнне тромбаў. Нікацін рэзка ўзмацняе назапашванне ў арганізме халестэрыну, павышае ўтрыманне ў крыві злучэнняў, якія выклікаюць утварэнне тлушчу. Усё гэта разам узятае прыводзіць да ішэмічнай хваробы сэрца, якая нярэдка пераходзіць у інфаркт міякарда.

Каварства тытуню ў тым, што яго разбуральная работа да пары да часу схаваная ад чалавека. Нярэдка толькі за 3—4 тыдні да трагічнага канца курцы пачынаюць адчуваць боль у вобласці сэрца, цяжар у руках, асабліва ў левай, што г

АПЛАТКАВЫЯ СПАТКАННІ Ў ЛАГІШЫНЕ

ЛАГІШЫН, адзіны на Піншчыне гарадскі пасёлак, слаўны перш за ўсё гісторыяй сваіх храмаў. У цэнтры яго ўзносяцца купаламі да неба праваслаўная Свята-Праабражэнская царква і чырвоны каталіцкі касцёл Святых Пятра і Паўла. А людзі тут спрадвеку жывуць у згодзе і шануюць агульную заступніцу — Маці Божую Лагішынскую.

Абразу больш за 300 гадоў. Цяпер ён знаходзіцца ў алтары касцёла. А першы касцёл у Лагішыне ўзвёў у 1634 годзе Пінскі староста Альбрэхт Станіслаў Радзівіл. Пасля паўстання 1863 года касцёл трапіў у няміласць, быў перанесены на праваслаўныя могілкі, а потым згарэў. На яго месцы ў канцы XIX стагоддзя пабудавалі праваслаўную царкву. Але лагішынскія католікі не здраджвалі сваёй веры, і ў 1909 годзе пабудавалі свой прыгожы храм. Знакаміты ж абраз усё адно захоўваўся ў праваслаўнай царкве. Ды ў 1938 годзе яго тайком вывезлі ў Польшчу. І толькі 13 гадоў таму Маці Божая Лагішынская вярнулася на радзіму. У маі 1997 года кардынал Казімір Свёнтэк правёў каранацыю цудадзейнага абраза.

Цяпер пакланіцца Маці Божай заходзяць усе лагішынцы, бо ўсе лічаць яе сваёй. І «Калядныя сустрэчы» сталі агульным святам пасёлка, хоць ужо 15 гадоў іх рыхтуюць і ладзяць актывісты Лагішынскага аддзела «Саюза палякаў на Беларусі». Як сказала кіраўнік гэтай грамадскай арганізацыі Яніна Лукашэвіч, «сустрэчы» сталі не проста культурным мерапрыемствам, а знакавай штогадовай падзеяй для ўсяго Лагішына. «Калядныя сустрэчы», іншая іх назва «Аплаткавыя спатканні», праводзяцца пасля 7 студзеня, калі Раство наступае для ўсіх жыхароў пасёлка. А ўдзельнікі гуртка па вывучэнні польскай мовы рыхтуюць святочную тэатралізаваную праграму на тэму Раства Хрыстова. Кожны год праграму паказваюць новыя ўдзельнікі, таму кожны раз пішацца новы сцэнарый. Вітаюцца імправізацыі, фантазія і творчая навізна юных сцэнарыстаў. Абавязковым элементам свята па традыцыі з'яўляецца абмен і частаванне аплаткамі — асвечаным хлебам.

З цягам часу гасцей «Калядных сустрэчаў» становіцца ўсё болей. Сёлета на 15-ы святочны вечар прыехалі ў ліку іншых загадчыкі аддзелаў адукацыі і культуры Пінскага раёна, прыйшлі старшыня Лагішынскага пасяковага Савета, кіраўнікі мясцовых устаноў адукацыі. Ну а месцічы прыходзілі сем'ямі. Галоўнае, паводле слоў Яніны Лукашэвіч, удзельнікі імпрэзы вельмі стараліся і змаглі запаліць гледачоў святочным настроем. Усе частаваліся аплаткамі, віншавалі адзін аднаго з калядамі, жадалі шчаслівага і ўдачлівага года.

Яніна Браніславаўна — настаўніца. І як кіраўнік грамадскай арганізацыі яна будуе працу найбольш з асветніцкім ухілам. Вясковы дзіцячы гурток па вывучэнні польскай мовы, які, дарэчы, яна сама і вядзе, быў не раз адзначаны на раённым і абласным узроўні. Бо навучэнцы гуртка неаднойчы з конкурсаў, алімпіяд прывозілі дыпломы і граматы. Вось і не так даўно вучаніцы Лагішынскай школы Таццяна Чэмбург і Юлія Дубнавіцкая занялі прызавыя месцы на конкурсе знаўцаў польскай мовы. Моладзь з задавальненнем вывучае мову сваіх продкаў, адзначае Яніна Лукашэвіч. І не толькі мову, але і гісторыю. У Лагішыне з 2003 года дзейнічае клуб аматараў польскай кніжкі. Аб'яднанне створана пры мясцовай бібліятэцы. Сябры клуба не толькі чытаюць польскую літаратуру, але і ездзяць на экскурсіі па гістарычных мясцінах Польшчы і Беларусі. З арганізацыяй экскурсій па Польшчы, як правіла, дапамагаюць польскія фундатары. Але як заўважыла кіраўнік грамадскай арганізацыі: «Мы ніколі нічога не просім, лічым гэта непрымальным для сябе. Калі прапануюць нейкую дапамогу літаратурай, метадычнымі матэрыяламі, асветніцкім турызмам — прымаем з падзякай. Астатняе робім самі. Усе нашы 58 сяброў арганізацыі штомесяц здаюць членскія ўзносы. Гэта зусім невялікая сума. Але яе хапае, каб адзначыць некага сувенірам у юбілейны дзень, правесці сумесную вечарыну на свята, альбо аказаць невялікую дапамогу ў сувязі з сумнай падзеяй». Яніна Браніславаўна таксама распавяла аб тым, што іхняя суполка, як і ўсялякая грамадская арганізацыя, мае свой статут. І самае важнае — свае традыцыі.

Адна з іх — душэўныя вечаровыя сустрэчы, дзе ўшаноўваюць юбіляра. Такія вечарыны ўсім палюбіліся, асабліва людзям сталага і сярэдняга ўзросту. Да іх рыхтуюцца. Хто прыносіць свой фірмовы пірог, а хто выконвае песню, якую абавязкова ўсе падхопліваюць.

Як сказаў карэспандэнту «Звязды» **начальнік аддзела па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Брэсцкага аблвыканкама Аляксандр МУРАШКІН**, *Лагішынскі аддзел «Саюза палякаў на Беларусі» — адзін з прыкладаў нефармальнай работы грамадскага аб'яднання ў глыбінцы. Па-першае, гэта заслуга ўсіх членаў суполкі, якія даўно захоўваюць традыцыі. А па-другое, заслуга цяперашняга кіраўніка, якая здолела аб'яднаць людзей ідэяй гісторыка-культурнай асветы і шмат зрабіць у гэтым кірунку. Лагішынцы — нязменныя ўдзельнікі фестываляў нацыянальных культур рознага ўзроўню. Добра, што ў грамадскую работу ўцягваецца моладзь. Моладзь удзельнічае ў вельмі важнай патрыятычнай справе. Разам з Янінай Браніславаўнай лагішынскія старшакласнікі, студэнты на канікулах даглядаюць магілы салдатаў Першай сусветнай вайны на мясцовых могілках.*

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Открытое акционерное общество «БЕЛОРУССКАЯ ВАЛЮТНО-ФОНДОВАЯ БИРЖА»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, КОТОРОЕ СОСТОИТСЯ 24 марта 2010 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 48 «а».

Регистрация участников с 14.30 до 14.55.

Повестка дня собрания:

Об утверждении отчета о деятельности Общества за 2009 год, бухгалтерского баланса за 2009 год, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 год.

Об утверждении заключения Ревизионной комиссии о деятельности Общества за 2009 год.

Об использовании прибыли Общества за 2009 год и направлении использования прибыли Общества в 2010 году.

Об увеличении уставного фонда ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Об избрании Председателя Общего собрания акционеров, членов Наблюдательного совета, Ревизионной комиссии.

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, сформирован на основании реестра акционеров по состоянию на 10.02.2010.

Для регистрации участнику при себе необходимо иметь документы, удостоверяющие личность и подтверждающие полномочия на участие в собрании. **Телефон для справок: 209 41 18.**

УНН 101541722.

ДЛЯ СВЕДЕНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ЛИДАПИЩЕКОНЦЕНТРАТЫ»

Повестка дня очередного собрания акционеров ОАО «Лидапищеконцентраты» дополнена следующими вопросами:

11. Об утверждении показателя по экономии ресурсов на 2010 год.

12. Об утверждении регламента работы с реестром владельцев ценных бумаг ОАО «Лидапищеконцентраты».

УНП 500021268.

Открытое акционерное общество «ЗАВОД ПО РЕМОНТУ И ТЕХНИЧЕСКОМУ ОБСЛУЖИВАНИЮ ВЫЧИСЛИТЕЛЬНОЙ ТЕХНИКИ»

(сокращенное наименование: ОАО «Белсчеттехника»)

СООБЩАЕТ, ЧТО ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ СОСТОИТСЯ 25 марта 2010 года в 13.00 по адресу: г. Минск, пер. Бехтерева, д. 8, каб. 405 (актовый зал).

Повестка дня:

1. Отчет дирекции о деятельности ОАО «Белсчеттехника» в 2009 году и задачах по обеспечению выполнения показателей социально-экономического развития на 2010 год.

2. Заключение Ревизионной комиссии о проверке финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белсчеттехника» за 2009 год.

3. Утверждение годового баланса ОАО «Белсчеттехника» за 2009 год.

4. Утверждение направлений использования чистой прибыли в 2010 году.

5. Утверждение размера и порядка выплаты дивидендов за 2009 год.

6. Об условиях материального вознаграждения членов Наблюдательного совета (совета директоров) и Ревизионной комиссии ОАО «Белсчеттехника».

7. Об утверждении решения об аннулировании дополнительно выпущенных акций ОАО «Белсчеттехника».

8. Об уменьшении размера Уставного фонда ОАО «Белсчеттехника» путем аннулирования дополнительно выпущенных акций.

9. Об утверждении Регламента работы ОАО «Белсчеттехника» с реестром владельцев ценных бумаг.

10. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

11. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белсчеттехника» (утверждение новой редакции Устава Общества).

12. Выборы членов Наблюдательного совета (совета директоров) и Ревизионной комиссии ОАО «Белсчеттехника».

Начало регистрации в день проведения и по месту проведения общего собрания акционеров в 12.30.

С материалами повестки дня общего собрания акционеров можно ознакомиться у секретаря Наблюдательного совета по адресу: г. Минск, пер. Бехтерева, д. 8, к. 1 (приемная) в рабочие дни (понедельник — пятница) с 11.00 до 12.00.

Участникам собрания при себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

Телефон для справок (8 017) 295 23 68.

Наблюдательный совет.

УНП 100064838

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	**Здание аптеки с сооружениями и право заключения договора аренды земельного участка**
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., Брестский р-н, д. Новые Лыщицы, ул. Октябрьская, д. 25
Продавец недвижимого имущества	Брестское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», тел. 80162 41 69 50, 21 20 45
Сведения о предмете аукциона	Здание 1-этажн., 1953 г.п., площадь – 57,0 кв.м, холодная пристройка, погреб, сарай, уборная, воздушная линия 0,4 кВ, водопроводная сеть. Земельный участок площадью 0,1711 га, для размещения промышленного производства, общественного питания, торговли и услуг, срок аренды – 50 лет.
Начальная цена предмета аукциона, руб.	17 717 413
Сумма задатка, руб.	1 771 000
Организатор аукциона	**Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 20 87 85, 23 12 63. www. brest–region.by**

Аукцион состоится **23 марта 2010 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – 22.03.2010 г. включительно.

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 22 марта 2010 года включительно.

Хаўрус Казіміра Сваяка

Жывая памяць

СЁННЯ — 120 гадоў з дня нараджэння беларускага святара, паэта, драматурга і філосафа Канстанціна Стаповіча, больш вядомага пад літаратурным псеўданімам Казімір СВАЯК. Яго імя вядома не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Колькі вучоных, даследчыкаў і краязнаўцаў вывучалі яго жыццё і творчасць! Колькі напісана прац! Здавалася б, ужо не засталося ні адной «белай плямы», усё даследавана і расказана. Але нядаўна мне трапіў у рукі рарытэтны фотаздымак, які зберагла парафіянка Клюшчанскага касцёла Тэрэса Віктараўна Сусвіла. Ён стаў сапраўдным падарункам да юбілею слыннага земляка.

Гэтаму фотаздымку без малога сто гадоў. Перад намі — знакаміты 40-асабовы беларускі хор Клюшчанскага касцёла, які ў 1915 годзе стварыў ксёндз Канстанцін Стаповіч (Казімір Свояк).

«Працу на беларускай культурнай ніве пачынае Кастусь ад арганізацыі перадусім касцёльнага хору, з якога хутка развіўся «Хаўрус Сваякоў» — піша ў сваіх «Успамінах пра Казіміра Сваяка» яго брат Бярнард Стаповіч.

Амаль усе 40 асобаў аўтаматычна сталіся ўдзельнікамі «Хаўрусу Сваякоў». Апрача іншых парафіян, удзельнікамі хору былі Адольф Клімовіч, інжынер, аграном і вядомы беларускі дзеяч; таленавіты малады мастак — Ракіцкі (імя невядома), які таксама рана пайшоў з жыцця. Некаторы час жыў у Засвіры, дзе працаваў Стаповіч. Маляваў абраз святога Язафата Кунцэвіча для галоўнага алтара Засвірскага касцёла. Многія згадвалі пра карціну з выявай Сваяка на прыступках Клюшчанскага касцёла, з малітоўнікам у руках, і лічаць, што гэта работа магла належаць Ракіцкаму альбо Драздовічу. На жаль, да нашага часу карціна не захавалася.

Спявалі ў хоры Віктар і Валянціна Смаленскія, у гумне якіх адбылася пастаноўка п'есы «Паўлінка» (1914) з удзелам Янкі Купалы і Паўліны Мядзёлкі. Валянціна Смаленская працавала настаўніцай у роднай вёсцы Стаповіча — Баранях, куды яна прыязджала з Клюшчан. Удзельнічалі ў хоры і яшчэ некалькі настаўнікаў, а таксама моладзь з навакольных вёсак.

Акрамя касцёльных спеваў удзельнікі хору развучвалі і беларускія народныя песні. А яшчэ чыталі лекцыі, праводзілі літаратурныя вечары. На першыя ўгодкі з дня стварэння хору Стаповіч напісаў рэферат «Аб беларускай песні», які прачытаў адзін з удзельнікаў хору. З ліку харыстаў была створана драматычная група.

У хоры Клюшчанскага касцёла спяваў і мой дзед, Ян Субач, які быў стрыечным братам Канстанціна Стаповіча па мацярынскай лініі і таксама меў добры голас. У гэтым жа хоры спявала і маці Тэрэсы Сусвілы, у спадчыну якой дастаўся гістарычны фотаздымак, — Шапура Вераніка Мікалаеўна.

— Мама расказвала, што ксёндз Стаповіч быў высокі, прыгожы, статны і вельмі добры, — узгадвае спадарыня Тэрэса. — Памятала казанні, якія ён вёў на беларускай мове. Ён стараўся далучыць моладзь да чытання, даваў кніжкі, выпісваў людзям беларускія газеты за свой кошт. Яго любілі і цешыліся кожны раз, калі прыязджаў у Клюшчанскі касцёл, каб замяніць якога-небудзь ксяндза.

Гэты фотаздымак Тэрэса Віктараўна перадала для будучага музея Стаповіча, які, мы маем надзею, будзе адчынены ў вёсцы Барані ў год яго 120-гадовага юбілею.

Іаланта ВАЛУЕВІЧ,
в. Спонды, Астравецкі раён.

На прыступках плебаніі: кс. К.Стаповіч — у другім радзе 6-ы справа, Карпінская Валянціна (у дзявоцтве — Смаленская) — побач са Сваяком 5-я справа ў другім радзе. Арганіст (прозвішча невядома) — у другім радзе 4-ты злева. Шапура Вераніка — у першым радзе 2-я злева. Ян Субач — у перадапошнім радзе 2-і справа. Астатнія імёны ўстанавіць немагчыма.

Уважаемые акционеры ОАО «Знамя индустриализации»

30 марта 2010 года состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Знамя индустриализации» по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, зал заседаний.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2009 году и основных направлениях деятельности Общества на 2010 год.

2. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2009 году. Оценка деятельности директора Общества Наблюдательным советом. Отзыв Наблюдательного совета о годовом балансе Общества.

3. О результатах проверки Службой ведомственного контроля концерна «Беллегпром» и проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.

4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 год.

5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2009 год. О выплате дивидендов за 2009 год.

6. Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2010 год и I квартал 2011 года.

7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.

8. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.

9. О субсидии на безвозвратной основе из инновационного фонда концерна «Беллегпром» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 25 августа 2006 года № 528 «О некоторых мерах по стабилизации финансового положения отдельных организаций».

10. Об увеличении уставного фонда Общества путем выпуска дополнительных акций на сумму субсидии, предоставленной из инновационного фонда концерна «Беллегпром».

11. Утверждение решения о выпуске дополнительных акций.

12. Утверждение изменений и дополнений в Устав Общества.

13. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, в рабочие дни **с 19 по 29 марта 2010 года** по месту нахождения общества (ком. 34), **с 9 часов до 16 часов, 30 марта 2010 года** по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания **с 13 часов до 13 часов 45 минут** по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — **30 марта 2010 года в 14 часов.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию **на 01 марта 2010 года.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

- акционеру Общества — паспорт,
- представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 300200360 **Наблюдательный совет ОАО «Знамя индустриализации»**

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «БЕЛДОРТЕХНИКА»

26 марта 2010 г. в 15.00 состоится очередное общее собрание акционеров. Место проведения собрания: г. Смолевичи, ул. Торговая, 14 «Б», актовый зал. Регистрация с 14.30 до 15.00.

Повестка дня общего собрания акционеров ОАО «Белдортехника»

1. Отчет о работе Наблюдательного совета в 2009 году.

2. О финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год и перспективах развития Общества на 2010 год.

3. О результатах проверки Ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.

4. Утверждение годового баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2009 год.

5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2009 год.

6. Утверждение направления использования чистой прибыли на 2010 год и первый квартал 2011 года.

7. Об избрании членов Наблюдательного совета, Ревизионной комиссии, условиях вознаграждения.

8. Об оказании спонсорской помощи в 2010 году.

9. О регламенте работы Акционерного Общества с реестром владельцев ценных бумаг.

Ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания можно в рабочие дни **с 14.00 до 16.00** по месту нахождения Общества (г. Смолевичи, ул. Торговая, 14 «Б», комн. 312), начиная **с 20.02.2010 г.**

УНН 100135303

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 1, г. ВИТЕБСК»

25 марта 2010 года в 14.00 состоится общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»

Собрание пройдет по адресу: г. Витебск, ул. Суворова,16, актовый зал

Повестка дня собрания:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год и основных направлениях деятельности Общества на 2010 год.

2. О работе Наблюдательного совета в 2009 г. Отзыв Наблюдательного совета о годовом балансе Общества.

3. Утверждение заключения аудиторской проверки финансовой отчетности Общества за 2009 год, заключения Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2009 год.

4. Утверждение годового отчета и баланса Общества.

5. Утверждение порядка распределения чистой прибыли за 2009 год. О выплате дивидендов за 2009 год.

6. Утверждение плана распределения чистой прибыли на 2010 год.

7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.

8. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

9. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

10. Об утверждении списка аффилированных лиц Общества.

11. Об утверждении регламента работы акционерного Общества с реестром владельцев ценных бумаг.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Суворова,16 (Наблюдательный совет) с 22 по 25 марта 2010 года (время работы с 8.30 до 17.30), либо 25 марта 2010 года по месту проведения собрания, тел. 37 45 66, 37 33 52.

Регистрация участников собрания **с 12.30 до 13.45** по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 25 марта 2010 года в 14.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 18 февраля 2010 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 300000398 **Наблюдательный совет.**

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 23 марта 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лотов	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Габровская	0,0096	1 год	установка и обслуживание павильона по приему вторсырья	740100000006002512	796 000	72 000
№ 2	улица Симонова (р-н смотровой пл. УГАИ УВД Могоблисполкома) (ограничения – оз. Святое)	0,0015	1 год	установка и обслуживание павильона (№ 6) по оказанию страховых услуг	740100000005004364	90 000	8 000
№ 3	улица Симонова (р-н смотровой пл. УГАИ УВД Могоблисполкома) (ограничения – оз. Святое)	0,0015	1 год	установка и обслуживание павильона (№ 7) по оказанию страховых услуг	740100000005004363	90 000	8 000
№ 4	бульвар Днепровский (р-н остановки «Микрорайон «Юбилейный-2»)	0,0030	2 года	размещение торгового объекта по продаже печатных изданий и розничной торговли	740100000004003230	433 000	39 000
№ 5	улица Крупской (р-н остановки «Средняя школа № 15» (в центр)	0,0020	2 года	размещение торгового объекта по продаже печатных изданий и розничной торговли	740100000002005425	163 000	15 000
№ 6	улица Народного Ополчения (р-н жилого дома № 20)	0,0036	2 года	размещение торгового объекта по продаже печатных изданий и розничной торговли	740100000004003229	566 000	51 000
№ 7	улица Турова (р-н жилого дома № 10)	0,0020	2 года	размещение торгового объекта по продаже печатных изданий и розничной торговли	740100000002005426	200 000	18 000
№ 8	в/ч «Пашково» (р-н жилого дома № 79) (ограничения – р. Дубровенка)	0,0047	1 год	размещение объекта розничной торговли	740100000001005448	235 000	21 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносят **задаток** в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой.**

1) Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

2) Условие предоставления земельных участков в аренду: согласование типа киосков, павильонов с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

3) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

4) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная (общая) сумма затрат (на всех победителей) составляет 10 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 17.03.2010 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

Наблюдательный совет ОАО «МЭФЗ» сообщает, что 24 марта 2010 года в 16.00 в актовом зале завода по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100 состоится очередное собрание акционеров ОАО «МИНСКИЙ ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНО-ФУРНИТУРНЫЙ ЗАВОД».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.

2. Об утверждении годового баланса, отчета о прибылях и убытках, отчета Ревизионной комиссии за 2009 год.

3. Задачи ОАО «МЭФЗ» на 2010 год.

4. О начислении дивидендов за 2009 год, план распределения прибыли на 2010 год.

5. Об избрании Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

6. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

7. Об увеличении уставного фонда Общества в соответствии с Указом Президента РБ от 25.08.2006 г. № 528.

8. Об увеличении доли государства в уставном фонде Общества при оказании мер государственной поддержки.

9. О принятии и утверждении регламента работы Общества с реестром владельцев ценных бумаг.

УНП 100219829

УВЕДОМЛЕНИЕ НАБЛЮДАТЕЛЬНЫЙ СОВЕТ ОАО «УНИВЕРСАМ РИГА» сообщает о проведении очередного Общего собрания акционеров, которое состоится 24 марта 2010 года в 13.00 со следующей повесткой дня:

1. О результатах работы Общества за 2009 год и основных направлениях деятельности Общества в 2010 году.

2. Отчет Наблюдательного совета о проделанной работе в 2009 году.

3. Утверждение заключения Ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год. Рассмотрение результатов аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2009 год.

4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счета «Прибыли и убытки» Общества за 2009 год.

5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) за 2009 год и выплате дивидендов.

6. О направлениях использования чистой прибыли в 2010 году.

7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 50, торговый центр «Рига».

Регистрация участников собрания будет проводиться в день собрания с 12.30 до 13.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера — доверенность и документ, удостоверяющий личность.

УНН 100299678 **Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига»**

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Ванкувера

ХАКЕЙНЫ ДЭБЮТ: 50 ПРАЦЭНТАЎ МІНУС

Вынікі шостага дня спаборніцтваў

Завяршыўся чарговы дзень спаборніцтваў XXI зімовай Алімпіяды. Медалі разыграныя ў сямі дысцыплінах: лыжных гонках (індывідуальны спрынт у мужчын і жанчын), горных лыжах (жаночы хуткасны спуск), каньках (мужчыны, 1000 м), парных санях, шорт-трэку (жанчыны, 500 м), сноўбордзе (мужчыны, хафпайп). Адны з самых яркіх падзей — тры залатыя медалі каманды ЗША, дзякуючы чаму яна лідзіруе ў медальным заліку, першыя «золата» і «серабро» зборнай Расіі, сярэбраны медаль зборнай Латвіі ў санным спорце.

ГАРНАЛЫЖНЫ СПОРТ

На хуткасным спуску перамагла знакамітая амерыканка Ліндсэй Вон. Яна апярэдзіла сваю суайчыннiцу Джулію Манкуза, якой дасталося «серабро», на 0,56 секунды. «Бронза» ў Элізабет Гергль з Аўстрыі. Прадстаўніцы Беларусі ў гэтых спаборніцтвах не ўдзельнічалі.

ЛЫЖНЫ СПОРТ

Першае «золата» Алімпійскіх гульняў у Ванкуверы з'явілася ў расіян. Яго заваяваў у фінале мужчынскай спрынтарскай гонкі класічным стылем Мікіта Крукаў. Прадстаўніку лыжнага спорту дасталося і першае «серабро» расійскай зборнай, Аляксандр Панжынскі падтрымаў поспех свайго сябра па камандзе. Бронза ў нарвежца Петэра Нортуга. Беларускія лыжніцы Анастасія Дубарэзава і Вольга Васілёнак не прайшлі ў 1/4 фіналу спрынтарскіх гонак. Дубарэзава паказала 42-і вынік, Васілёнак — 46-ы.

КАНЬКАБЕЖНЫ СПОРТ

Двухразовым алімпійскім чэмпіёнам па канькабежным спорце стаў амерыканец Шані Дэвіс. Ён паказаў час 1.08, 94, што на 0,0018 сек. лепш за вынік паўднёвакарэйца Тай Бум Мо. Адметна, што роўна чатыры гады таму, 18 лютага, на XX Алімпійскіх гульнях у Турыне Шані Дэвіс з вынікам 1.08, 89 таксама заваяваў залаты медаль. А ў прадстаўніка Паўднёвай Карэі гэты другі медаль сёлетняй Алімпіяды, алімпійскім чэмпіёнам ён стаў на дыстанцыі 500 метраў. Бронзавы медаль у амерыканца Чэда Хендрыка.

САННЫ СПОРТ

Сенсацыяй стала выступленне на Алімпійскіх гульнях прадстаўнікоў Латвіі ў санным спорце. Андрыс і Юрыс Сіксы ў спаборніцтвах у двухмесным экіпажы заваявалі «серабро». А «золата» дасталося аўстрыйскаму дуэту Андрэас і Вольфганг Лінгеры. На трэцім месцы немцы Патрык Ляйтнер і Аляксандр Рэш.

ШОРТ-ТРЭК

Пераможца сёлетніх Алімпійскіх гульняў па шорт-трэку кітаянка Ван Мэн у чвэрцьфінальным і паўфінальным забегах на 500 м двойчы абнавіла алімпійскія рэкорды. Яна стала двухразовай алімпійскай чэмпіёнкай, апярэдзіўшы ў фінале канадку Марыяну Сэн-Жэлей і італьянку Арыяну Фантана.

СНОЎБОРДЫНГ

На мажорнай ноце завяршылі чарговы алімпійскі дзень спартсмены ЗША. Амерыканец Шон Уайт стаў двухразовым алімпійскім чэмпіёнам, паказаўшы ў другой фінальнай спробе 48,4 балы. Гэта трэцяе «золата», заваяванае ў гэты дзень амерыканскімі атлетамі.

Краіна	Золата	Серабро	Бронза	Усяго
1. ЗША	5	3	6	14
2. Германія	3	4	3	10
3. Паўднёвая Карэя	3	2	0	5
4. Швейцарыя	3	0	1	4
5. Канада	2	3	1	6
6. Францыя	2	1	4	7
7. Кітай	2	1	1	4
8. Швецыя	2	0	0	2
9. Нарвегія	1	2	2	5
— Аўстрыя	1	2	2	5
11. Расія	1	1	1	3
12. Славакія	1	1	0	2
13. Чэхія	1	0	1	2
14. Галандыя	1	0	0	1
15. Польшча	0	2	0	2
16. Італія	0	1	3	4
17. Японія	0	1	1	2
18. Аўстралія	0	1	0	1
— Латвія	0	1	0	1
— Эстонія	0	1	0	1
— Фінляндыя	0	1	0	1
22. Харватыя	0	0	1	1
— Славенія	0	0	1	1

Учора на XXI Алімпійскіх гульнях у Ванкуверы ў бой уступілі хакеісты. Матч з камандай Фінляндыі падначаленыя Міхаіла Захарава ўступілі з лікам 1:5.

Вострыя размовы аб закаце славы айчынных майстроў шайбы у сувязі з адстаўкай канадца Глена Хэнлана за 100 дзён да пачатку Алімпійскіх гульняў пачынаюць набываць свае сапраўдныя абрысы. Нацыянальная зборная сапраўды, мяркуючы па гульні з фінамі, падобна была на бездапаможнага драпежніка, які і рады быў ухапіць здабычу, ды не можа — сілы не дазваляюць. Хоць будзем шчырымі: багаж, набыты гульцамі Беларусі, што выступаюць у Кантынентальнай хакейнай лізе і НХЛ, можа быць дастатковы, каб прайсці кваліфікацыйны раўнд, нягледзячы ні на якія складанасці. А яны ёсць.

На пасляматчавай прэс-канферэнцыі галоўны трэнер беларусаў Міхаіл Захараў, відаць, не толькі ў якасці камплімента, сказаў: мы саступілі камандзе, якая дастойна будзе змагацца за медалі алімпійскага турніру. Настаўнік фінаў дыпламатычна падмеціў, што гульня насіла складаны характар. І канчатковы вынік на табло зусім не азначае, што беларусаў можна было закідаць шапкамі. Проста на сёння ў шэрагах Суомі, засяродзіў увагу журналістаў Яланен, быў падбор гульцоў нашмат мацнейшы, чым у суперніка, што ў выніку і адбілася на ходзе паядынку.

Сапраўды, у стартавым матчы ўчарашняга ўзору ў шэрагах фінаў было толькі некалькі хакеістаў, якія гулялі на леташнім чэмпіянаце свету ў Швейцарыі і якія прайгралі беларусам 1:2 па булітах на стадыі чвэрцьфіналу. Практычна ўсе 100 працэнтаў — прадстаўнікі Нацыянальнай хакейнай лігі. А ў нас, падкрэсліў Міхаіл Захараў, цяпер у абойме энхаэлаўцаў на 50 працэнтаў менш у параўнанні з узгаданым ужо паядынкам. Праўда, калі гаварыць па-іншаму, то ў шэрагах зборнай не хапае двух прадстаўнікоў вядучай заакіянскай лігі — Міхаіла Грабоўскага з «Таронта» і Андрэя Касціцына з «Манрэаля». А яшчэ двое — Руслан Салей з «Каларада» і Андрэй Касціцын з «Манрэаля» поўнасцю не апраўдаліся ад атрыманых траўмаў. Вось такая хакейная матэматыка.

Трэба аддаць належнае гульцам. Той жа Салей у мікс-зоне лядовага Canada Place ў размове з беларускімі журналістамі адзначыў: Коваль нам падарыў шанц. Дзякуй галкіперу, які сваёй надзейнай гульнёй даў нам магчымасць да сярэдзіны матча гуляць на роўных з фінамі. Хоць з такім падборам гульцоў, прызнаўся абаронца «Каларада» і нацыянальнай зборнай, разлічваць на шмат не прыходзіцца. Тым не менш адсутнасць ключавых хакеістаў — Грабоўскага і Касціцына-старэйшага — гэта факт, які не павінен змяншаць узровень адказнасці гульцоў за вынік матча з любым супернікам.

Сяргей Касціцын на другім канцы Канады хоць і не карыстаецца такой папулярнасцю, як у Манрэалі, але ж доўгі час быў у акружэнні канадскіх і расійскіх журналістаў. Аўтар адзінага забітага гала ў вароты фінаў выказаў шкадаванне, што сёння мы з фінамі былі ў розных вагавых катэгорыях не толькі па падборы імёнаў, колькі па выканаўчым майстэрстве. Тым не менш, сказаў Андрэй, у паядынку Беларусь — Фінляндыя быў момант, калі беларусы намацалі сваю гульню і ў нейкі момант нават маглі зраўняць лік. Паводле яго слоў, у зборнай Беларусі яшчэ нічога не страчана ў плане далейшага выхаду ў плэй-оф турніру. І найбліжэйшы матч са шведамі павінен гэта пацвердзіць.

Цікава, што каманда Швецыі да гэтага часу неабыякава ўспамінае матч 1/8 фіналу на Алімпійскіх гульнях-2002 з камандай Беларусі ў Солт-Лейк-Сіці, калі Уладзімір Копаць за тры хвіліны да заканчэння сустрэчы трапіў шайбай у шлем галкіпера Томі Сало, якая потым паволі закацілася

Руслан САЛЕЙ.

ў вароты, і здабыў для Беларусі феерычную на той час перамогу. Айчынныя журналісты прапанавалі ў склад беларусаў на заўтрашні матч са шведамі ўпісаць у заявачны спіс прозвішча Копаця, на што Міхаіл Захараў усміхнуўся: а чаму б і не.

Цікава, што незалежна ад выніку кваліфікацыйнага раўнда, цэны на білеты ў перакупшчыкаў не зменшыліся, а значна выраслі. Так, на матч Беларусь — Фінляндыя яшчэ некалькі дзён таму ў гарадскім метро пры намінальным кошце ў 80 канадскіх долараў прадпрымальныя асобы прадавалі арыгінальныя квіткі на хакейны стадыён па 140, а ўчора ўжо прапаноўвалі па 200 долараў і ні цэнтам менш. Відавочна, што білеты на хакей будуць расці, бо жарсці падграюцца фенаменальнай выніковасцю камандаў Расіі і Канады, якія на старце забілі ў вароты супернікаў па 8 галоў кожная. Пры гэтым лідары лігі НХЛ — Аляксандр Авечкін, Яўген Малкін, Ілья Кавальчук, Сідні Кросбі, Дэні Хітлі і іншыя падтрымалі сваё высокае рэнаме.

Відавочна, што расійскія хакеісты сваёй адмысловай гульнёй з латышамі паспрыялі прарыву расійскай зборнай у заваяванні медалёў. За адзін учарашні дзень — «золата» і «серабро» ў мужчынскіх лыжах, пра гэта можна толькі марыць. А то расіяне ўжо запанікавалі. І гэта думка многіх журналістаў Міжнароднага прэс-цэнтра. Як вядома, генеральным спонсарам алімпійскай каманды Расіі з'яўляецца італьянская кампанія BOSKO, пад патранатам якой у межах алімпійскай вёскі для спартсменаў на час гульняў дзейнічае «Рускі Дом». Дык вось у якасці казырнай карты і дадатковай рэкламы з пачатку гэтага тыдня Выдавецкі дом «Коммерсантъ» і Група кампаній Баскодзі Чыльеджы арганізавалі спецыяльны праект — спецвыпуск газеты «КоммерсантъBOSKOsport» тыражом 2000 экзэмпляраў. За некалькі дзён алімпійскага турніру выйшла аж тры тыражы на добрай крэйдаванай паперы. Праўда, як толькі ў расіян настаў стопар з медалямі, выпуск газеты, відавочна, быў спынены, бо ніводнага экзэмпляра магчымых свежых нумароў ніхто з замежных калегаў-журналістаў не бачыў. Можна не сумнявацца, што такі антракт насіў часовы характар, і цяпер зноў будзе нагода для журналістаў карпункта газеты пісаць аб поспехах і перспектывах расійскага алімпійскага руху.

Прадстаўнікі расійскіх СМІ спадзяюцца, што подзвіг лыжнікаў прымусіць па-іншаму паглядзець на жыццё і біятланістаў, і цяпер яны скажуць сваё вырашальнае слова. Бо расійскі алігарх Міхаіл Прохараў, які ўзначальвае саюз біятланістаў Расіі, ужо зачакаўся вынікаў. Грошай патрачана шмат, а толку амаль ніякага! З чым сустракаць прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева, які мяркуе прыехаць у Канаду праз тыдзень і наведаць алімпійскія аб'екты ў Вістлеры?!

Зрэшты, цяпер наступаюць часы «ікс» і ў беларускіх біятланістаў. У найбліжэйшы алімпійскі дзень — індывідуальныя гонкі на 15 км у жанчын і 20 км у мужчын. Такія дысцыпліны — мара для сярэднячкоў, якія і бягуць, і страляюць хоць і не ў спрынтарскім рэжыме, але ж стабільна. Успомнім, што на Алімпійскіх гульнях-1998 у японскім Нагана на дыстанцыі 20 км бронзавы медаль заваяваў Аляксей Айдараў. А на зімовай Алімпіядзе-1992 у французскім Альбервіле, калі беларусы выступалі ў складзе аб'яднанай каманды СНД, нікому не знаёмы беларус Яўген Рэдзькін стаў у гэтым раздзеле праграмы алімпійскім чэмпіёнам: на чатырох агнявых рубяжах біятланіст не дапусціў ніводнага промаху. І тлумачэнні дакладнасці стральбы могуць быць простымі: вельмі ўжо дорага абыходзіцца нават адзін стрэл «у малако». Толькі ў гэтай індывідуальнай гонцы за недакладны стрэл аўтаматычна да агульнага часу біятланіста на дыстанцыі дадаецца адна хвіліна. Параўнаем: у звычайным фармаце адзін штрафны круг у 150 метраў спартсмен пераадольвае ў сярэднім за 25 секундаў. Зусім не выгадна мазаць.

Будзем спадзявацца, што следам за расійскім медальным прарывам наступіць свята і на вуліцы беларускіх алімпійцаў. Тым больш папярэднія гонкі біятланістаў паказалі: страляць дакладна мы навучыліся. Таму заўтра на стрэльбішчы алімпійскага парка ў Вістлеры скрыжуем пальцы. На ўдачу.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ПАРНАСЦЬ У КУЛЬТУРЫ ПРОДКАЎ І У НАШЫМ ЖЫЦЦІ

Яшчэ нашы бабулі і матулі, калі былі дзяўчатамі, варажылі аб сваім лёсе, перш за ўсё аб тым, будуць ці не будуць замужам. У марозную калядную ноч (гэта магло быць познім вечарам 24 снежня, 6, 13 або 19 студзеня) выбягалі яны ў двор, хапалі аберуч дровы ці, шырока раскінуўшы рукі, абхоплівалі штыкетнік і лічылі колькасць дошак. Парная колькасць паленцаў або штыкецін прадказвала хуткія шлюбавіны, замужняе жыццё, няпарная была знакам таго, што яшчэ год давядзецца «хадзіць у дзеўках», заставацца адной, без пары.

● У народзе існавала вера ў тое, што дзяўчына, якая з'есць спарыш (здвоеную сліву, бульбу, колас і г.д.), народзіць двайнятаў. Маці аднаго з аўтараў выкідвала слівы-спарышы нават тады, калі збіралі іх для варэння. І наадварот, верыла: калі насіць пры сабе арэхавы спарыш, то ўвесь час будзеш пры грашах.

● Сімволіка парнасці вызначала характар і асаблівасці выканання найбольш значных рытуальных дзеянняў разгорнутага вясельнага абраду. Верх вясельнага «хлеба-солі» (каравая, з якім маладых сустракалі перад парогам хаты) быў упрыгожаны двума кавалачкамі цукру, што павінна было сімвалізаваць «салодкі» лёс сямейнай пары. Вяршыню святочнага каравая ўпрыгожвалі дзвюма птушачкамі, выпечанымі з таго ж цеста, што і сам каравай. Побач з маладымі хросныя бацькі павінны сядзець толькі парай. Калі ж у жаніха або нявесты засталіся толькі маці або бацька, то яны не мелі права сустракаць маладых па адным. Прынцып падабенства лёсу тых, хто сустракаў, і тых, каго сустракалі, прадказваў маладым жыццё ў адзіноце.

● Знаёмства з вялікай колькасцю прыкметаў і павер'яў, рэгламентацыі і забаронаў абрадавай і гаспадарчай практыкі пераканаўча сведчыць, што шчаслівымі, спрыяльнымі для распачынання важных спраў з'яўляюцца цотныя дні: аўторак і чацвер (другі і чацвёрты). І наадварот, нешчаслівымі лічацца няцотныя дні: панядзелак (першы), серада (трэці) і пятніца (пяты). Менавіта з імі звязана найбольшая колькасць усялякіх абмежаванняў як у працы, так і ў харчаванні (серада і пятніца — посныя дні).

● Дзіўная рэч, на якую чамусьці не звяртаюць увагі этнографы. У нашы сучасныя песні і святкаванні (Каляды, Масленіца) прыйшло запазычанне з рускай культуры і побыту — асноўным вобразам зімовых святаў становіцца шпаркая тройка коней. Але ж на самрэч справе на Беларусі памочнікам чалавека ў гаспадарцы была не «тройка», а параконка («Запрагай сваю парку», — казалі ў народзе; поле аралі парай валоў).

● Калі гаспадар выбіраў на кірмашы ў бондара дзяжу, то абавязкова лічыў клёпкі. Існавала перакананасць: там, дзе іх цотная колькасць, — рошчына будзе добрая, а дзе няцотная — цеста будзе няўдалым, а хлеб ацеславым.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

СЁННЯ

Месяц

Першая квадра 22 лютага. Месяц у сузор'і Цяльца.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.21	17.26	10.05
Віцебск —	7.13	17.13	10.00
Магілёў —	7.11	17.16	10.05
Гомель —	7.04	17.16	10.12
Гродна —	7.36	17.42	10.06
Брэст —	7.33	17.46	10.13

Імяніны

Пр. *Марыі, Хрысціны, Анатоля, Васіля, Дзмітрыя, Івана, Максіма.*

К. *Альжбеты, Міраславы, Арнольда, Міраслава, Пятра.*

Фота Таццяны ПАДЛІПСКАЙ.



Дзве даты

19 лютага

1788 год — пачаў дзейнічаць Шклоўскі тэатр Зорыча — тэатральная трупа генерал-лейтэнанта графа Сямёна Зорыча. Акрамя прыгонных акцёраў, тут працавалі і прафесійныя салісты. Зоркамі тэатра былі, напрыклад, вядомы на ўсю Еўропу танцор Буткевіч і прыма-балерына Пелагея Азарэвіч. У 1800 годзе, пасля смерці графа, група салістаў была пераведзена ў балетную трупу Пецярбургскіх імператарскіх тэатраў.

1473 год — нарадзіўся Мікалай Капернік, славуты польскі астраном, аўтар геліяцэнтрычнай сістэмы свету. Капернік зрабіў сапраўдны пераварот у прыродазнаўстве, адмовіўшыся ад прынятага на працягу многіх стагоддзяў вучэння аб цэнтральным становішчы Зямлі.

Цытата дня:

«Чалавек, якому пашанцавала, — гэта чалавек, які рабіў тое, што іншыя толькі збіраліся рабіць».

Жуль Рэнар (1864—1910), французскі пісьменнік.

Два полюсы

ПРА ЗДРАДУ... ДУХОЎНУЮ

Шчыра ўпэўнены, што такое паняцце, як духоўная здрада, прыдумалі нашы каханыя, непаўторныя, такія вечна разумныя жанчыны. А псіхолагі, каб іх неяк падтрымаць, проста прыдумалі катэгорыі здрады.

Ужо калі пісаць па тэме шчыра, прызнаюся ў тым, што першы сэксуальны вопыт (яшчэ з мінулага стагоддзя... Колькі ж ужо гадоў прайшло?) быў менавіта з дзяўчынай, дарэчы, таксама Вікторыяй, якая вырашыла здрадзіць свайму каханаму. Ды пасля «гэтага» прызналася, што духоўна яна яму не здрадзіла. Каб я захадаў ніякіх не рабіў. Я і не збіраўся. Ён, дарэчы, быў жанатым чалавекам. Гэта маёй знаёмай, вядома ж, не падабалася, вось і вырашыла «пайсці налева». Маўляў, вось ноч, ён зараз з жонкай, хоць ведае пра мае шчырыя пачуцці, а чым жа я горшая?

Знаёмыя святары, з якімі я пагаварыў, не здзівілі каментарыямі па тэме. Пачуў у адказ, што ўсё аднолькава грэх: няважна, як здрадзіў, — духоўна ці целам. Гэта толькі «хітрасць» слабых духам людзей — дзяліць здрады на «катэгорыі». І ў прынцыпе я з імі згодны, нягледзячы на мае ў апошні час атэістычныя погляды.

Недзе чытаў, што менавіта жанчын абурае, калі іх «паловы» здраджваюць духоўна. Што ж гэта тады за «паловы»? Згодны! А мужчын абурае адпаведна наадварот — фізічная здрада каханых.

А разважанні псіхолагаў наконт таго, што жанчыны меней могуць адчуць асалоду пасля сэксу «на баку», бо іх будуць вельмі ціснуць адчуванне віны і таго, што здраджваючы бацьку дзяцей, здраджвае і апошнім, мякка кажучы, на мой погляд, спрэчныя. Пры гэтым лічыцца, што пры наяўнасці духоўнай блізкасці не з мужам, а з іншым мужчынам жанчына можа ў перспектыве перайсці да апошняга. А ці патрэбна яна будзе ямў

І такое меркаванне мне запомнілася: духоўная здрада ў жанчын часцей прыводзіць да фізічнай блізкасці. Па логіцы, калі мужчыны — «прымітыўныя істоты» — здраджваюць фізічна, то ў выніку могуць дайсці і да духоўнай здрады?

Значыць, атрымліваюць фантастычныя ўражанні ў паходах да палюбоўніц, таксама ў перспектыве могуць «перайсці» да адной з іх? Ды ніколі! У мінімуме выпадкаў! — ведайце, палюбоўніцы. І хай ён вам гаворыць, што яму з вамі так утульна, так цёпла духоўна, ён не будзе з вамі, нягледзячы на «духоўную блізкасць».

Вельмі цікава было пачуць словы па тэме ад паважаных жанчын. Адна прызналася, што здраджвала свайму мужу духоўна таму, што не ўсё можа яму расказаць, таму, што нешта скажаш яму, а ён няправільныя высновы робіць. А той... З ім пра ўсё амаль што можна пагаварыць. І, хай ён таксама несвабодны, галоўнае, што ёсць духоўная блізкасць.

Яшчэ адна жанчына трохі здзівіла сваімі разважаннямі. Яна лічыць, што духоўная здрада — гэта, напрыклад, калі яна — праваслаўная, а жаніх — каталік, і ў яго сям'і традыцыя, каб жаніліся (выходзілі замуж) толькі за каталікаў. Яна б «здрадзіла» — змяніла канфесію. Але мае асабістыя думкі — калі пачынаюць дзяліць адзінага Бога на канфесіі, гэта ўжо...

Ад мужчын пачуў (хто б сумняваўся, што так кажуць) пра карыснасць здрады — фізічнай. Маўляў, вяртаюся да жонкі і разумею, што яна ўсё адно лепшая! І яшчэ — вось здрадзіў жонцы, быццам бы пакахаў іншую, а дзе гарантыя, што і іншай не здраджу? Мужчынская логіка: спадабалася жанчына — і ўперад! Навошта з ёй потым у ложку думаць, як здрадзіў сваёй жонцы?

Мо і заблытана трохі апісаў свае думкі, але, пагадзіся, бясспрэчна: чалавек — адзінае цэлае фізічна і духоўна. І калі «фізіка» і «лірыка» ў чалавеку пачынаюць канфліктаваць (па рознаму здраджваць), гэта ўжо трэба браць талоны да ўрачоў. Здрадзіў (здрадзіла) дык здрадзіў, і якія тут могуць быць яшчэ апраўданні?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗАСТАЦЦА ВЕРНЫМ... САБЕ

Чытаю допіс паважанага, такога катэгарычнага апанента і міжволі ўсміхаюся да вушэй. Але ж, жанчыны «прыдумалі» здраду духоўную і ўвогуле здраду — яшчэ ў часы Адама, каварна прамяняўшы мужа на яблык... Гэта ўвогуле ў мужчынскім звычаі — рабіць акцэнт на тым, што «яна першая пачала». А з уласных вачэй калі бярвенне вымаць будзем, шаноўнае спадарства?

Гэта ж дадумаўся нейкі разумнік-«навуковец» (каб ведала дакладна, хто — рукі паадрывала б!) абвясціць як няўхільны факт, што мужчына — палігамны па натуры. І адразу мужыкі ўсяго свету ўзялі на ўзбраенне гэты досвед, радасна размахваючы ім, як сцягам свабоды на барыкадах. Не, дакладней — як індульгенцыяй на ўсё жыццё: маўляў, схадзіў налева — дык няма чаго абурацца, мала мне адной жанчыны, маю права налева, гэта прыродай закладзена... Чамусьці гэтыя сэксуальныя актывісты забываюцца на маленькую дробязь: прыродай закладзена, што самец, перш чым будзе дапушчаны да цела, павінен перамагчы ў бітве за самку іншых прэтэндэнтаў. Хто не верыць — можа па вясне ў найбліжэйшы заапарк зазірнуць. І пакіньце ўбаку састарэлыя перакананні «на дзесяць дзяўчат па статыстыцы дзевяць хлапцоў, значыць, мне дзве».

Ты вось узгадваеш, што жанчын абурае факт духоўнай здрады каханых, а мужчын — фізічнай. Па маіх жа назіраннях, людзі — незалежна ад полу — найчасцей не даруюць іншым тыя заганы, да якіх схільныя самі. Так, хлус шчыра крыўдуе, калі яго падманваюць, маніпулятар — калі бачыць бы ў люстэрку ўласную тактыку, а здраднік загадзя пачынае падазраваць і раўнаваць «палавінку» — калі я здольны, то і ён/яна таксама... Хоць мне здаецца, што біблейскае «вока за вока» тут цалкам справядлівае. Здраджваеш, падманваеш чужы давер, разлічваючы, што чалавек ад цябе так ці інакш, эмацыйна ці духоўна, залежыць, таму ўсё даруе, нават калі даведаецца? Альбо прыкрываешся цынічным «я ж ёй нічога не абяцаў, мы абодва свабодныя людзі»? То памятай, прынцып бумерангу ніхто не адмяняў, таму будзь гатовы ў адзін не надта добры момант апынуцца на месцы «рагатага», падманутага і пакрыўджанага. І ніякія самаапраўданні, што (на поўным сур'ёзе) часам даводзіцца чуць ад сталых быццам бы, дарослых, разумных людзей: «Я проста пераконваюся, што лепшай за яе няма, таму ўсё адно заўжды да яе вяртаюся» — не вызваляюць ад адказнасці за зробленае. Не перад каханым нават — а ці каханым насамрэч? — чалавекам. Перад сабой.

Уражваюць мяне мужы, якія вінавацяць ва ўласнай здрадзе... жонку — ах, распусцілася яна пасля вяселля, патаўсцела, падурнела, перастала сачыць за сабой і г.д. Зрэшты, як і жонкі, якія ківаюць на тое, што муж іх не разумее. Так і хочацца спытаць: а раней як было? Жылі вы, не тужылі, а потым — бац! — іншапланецяне падклалі ў ложак зусім чужога, дрэннага, непрыемнага чалавека? Ці ўсё адбывалася інакш, і вы таксама не заўжды былі белым і пушыстым? То выйсце побач: чужыя — разыходзяцеся, як у моры караблі, родныя і блізкія — пераадольвайце ўзаемную душэўную ляноту, эгаізм, крыўдачкі і непаразуменні, пачынайце нешта мяняць у кансерватыўнасці. Гэта ўсё ж больш сумленна, чым рабіць «як усе» — паводле сацапытанняў, і без таго інстытут сям'і перажывае не лепшыя часы, у краінах Еўропы і ў Расіі толькі чвэрць сужэнцаў захоўваюць вернасць адно аднаму...

Карацей, я да чаго — зноў да таго, што ўсякую праблему пачынаць вырашаць трэба з сябе. А здрада здрадай застаецца, як ты яе ні назаві — хоць экзістэнцыяльнай.

P.S. *Хлопец, які першым у жыцці пазваў мяне замуж, таксама быў Аляксандрам. Але я за яго не пайшла. Вырашыла не здраджваць сабе.*

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

УПРАВЛЯЮЩИЙ РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ БЕЛХЛЕБОПРОДУКТ» ХАДКЕВИЧ А.Д.

ПРОВОДИТ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ СКЛАДСКОЙ БАЗЫ 1975 ГОДА ПОСТРОЙКИ ПЛОЩАДЬЮ 1,2 га в г. ЗАСЛАВЛЬ В СОСТАВЕ:

3 кирпичных складских помещения (площадью 1205,7 кв. м, 985,5 кв. м, 581,6 кв. м), 2 административных здания (площадью 105,1 кв. м, 66,1 кв. м), крановая однопролетная эстакада с бетонным покрытием и двумя кран-балками грузоподъемностью по 5 т каждая (площадь 1440 кв. м). База примыкает к железнодорожной станции «Беларусь», подъездные пути, электрокабельная линия, водоснабжение, телефон.

Торги состоятся **26 февраля в 11 часов** по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15, ком. 201. Задаток для участников 20,0 млн руб. перечисляется на расчетный счет РУП «Торговый Дом Белхлебопродукт» № 3012200130017 в ОАО «Бел АПБ«МГД» г. Минск, код 963, УНП 100079803.

Заявки принимаются до 18.00 25 февраля 2010 г.

Начальная цена 800 000 000 бел. руб.

Конт. тел. 8(029) 120 98 56, 8(029) 614 02 69.

Усміхнемся!

Прыкметы.

Калі ваша жонка тэлефануе вам на працу кожныя дзве гадзіны, пытаецца пра ваша здароўе, цікавіцца, якое піва купіць да вячэры і як прыгатаваць мяса, пры гэтым нагадвае ўвесь час, што ў яе сёння зусім не баліць галава, значыць сёння ў вас на працы дзень зарплаты.

☺

— Ну і як табе атрымалася адпачыць у санаторыі?

— Ды ведаеш, ніякай розніцы ў параўнанні з офісам: вакол суцэльны натоўп прыдуркаў, якія балбочуць ні аб чым, поўзаюць з месца на месца, нічога не робяць і толькі чакаюць абеду.

☺

Хатні тэлефон патрэбен хоць бы для таго, каб знайсці мабільны...

☺

— А мы тут фільм-катастрофу глядзелі. Катастрофа ў тым, што Бандарчук зноў вырашыў, што ён рэжысёр!

☺

Сям'я праходзіць мытны агляд у аэрапорце. За дзеяннямі мытніка з цікавасцю назірае маленькая дачка. Раптам яна крычыць:

— Цяплей, цяплей!

НЕ ЗБОЧВАЙ НА ПАЛАВЫМ ШЛЯХУ!

Будзь у курсе!

РЫЗЫКОЎНЫМІ лічацца сэксуальныя паводзіны таго, хто спакушаецца на інтымны кантакт з трыма і болей партнёрамі на працягу аднаго года. Прычым незалежна ад таго, ці былі гэтыя кантакты абароненымі прэзерватывам. Так сцвярджае Сусветная арганізацыя аховы здароўя.

Сэксолагі кажуць: перад тым, як «заняцца сэксам», вызначце для сябе, наколькі ён бяспечны для вашага здароўя і... неабходны вам сёння. Усё ж такі вядома звыш 30 інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам. Некаторыя з іх могуць выклікаць толькі непрыемныя адчуванні, іншыя, калі не лячыць іх своечасова, прыводзяць да бясплоднасці ці нават больш сур'ёзных наступстваў, у тым ліку павышаюць рызыку злаякасных новаўтварэнняў. Акрамя таго, людзі, якія пакутуюць ад згаданых захворванняў, становяцца больш уразлівымі перад ВІЧ-інфекцыяй. Рызыка перадачы ВІЧ пры наяўнасці ІППШ павялічваецца ў 3-9 разоў, паколькі праз пашкоджаныя скурныя покрывы і слізістыя адкрываюцца дадатковыя шляхі пранікнення віруса.

За год у Беларусі рознымі формамі ІППШ хварэе каля 1 працэнта насельніцтва. На працягу апошніх гадоў назіраецца зніжэнне захваральнасці класічнымі венерычнымі захворваннямі (сіфіліс, ганарэя), але адзначаецца рост іншых ІППШ (хламідыёз, трыхаманіяз).

Невялікі леташні рост захваральнасці на сіфіліс у Гродзенскай і Магілёўскай абласцях звязаны з ростам захваральнасці сярод працоўных мігрантаў — увозам новых выпадкаў з-за межаў краіны. Невялікі ўздым захваральнасці па ганарэі зафіксаваны толькі ў Гродзенскай вобласці. Максімум зарэгістраваных выпадкаў трыхаманіднай інфекцыі назіраўся летась у Брэсцкай і Віцебскай абласцях. Хламідыйная інфекцыя найбольш істотна прырасла ў Мінскай вобласці.

У цэлым па краіне адзначаўся рост захваральнасці на мікаплазмоз. Найбольш значны рост быў зарэгістраваны ў Мінску — на 32 працэнты, а таксама ў Віцебскай вобласці — на 26,6 і Магілёўскай — на 53. У значнай ступені гэта абумоўлена ўкараненнем новых высокатэхналагічных метадаў лабараторнай дыягностыкі ўзбуджальніка. Захоўваецца прырост па краіне і выпадкаў кандыдозу мочапалавых органаў.

Паводле слоў **дацэнта кафедры дэрматавенералогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдата медыцынскіх навук Ірыны ШЫМАНСКАЙ**, новы метад лабараторнай дыягностыкі — полімеразна-ланцуговая рэакцыя ў рэжыме рэальнага часу — дазваляе дыягнаставаць фрагмент ДНК узбуджальніка і валодае ўнікальнай адчувальнасцю і спецыфічнасцю. Укараненне такога метаду ў практыку ўсіх абласцей дазваляе цяпер пазбягаць памылак.

Дарэчы, што да дыягностыкі, то падлеткі, напрыклад, могуць разлічваць на бясплатнае тэставанне па выяўленні ІППШ. Аднак для гэтага акушэр-гінеколаг ці ўролаг павінен выдаць адпаведнае накіраванне. Лячэнне таксама можа быць бясплатным, калі пацыент пагодзіцца лячыцца ў стацыянары. Калі ж ёсць жаданне набываць л